Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 296 (3894)
СУБОТА, 20 СЬНЕЖНЯ
1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзённа за выключэньнем панядзелкаў.

Москва, Б-ка ВСНК БССР
Сек. | Зьв.-I |

Национальная библиотека Минск-С.Н.Х.

За няўхільнае нарастаньне тэмпаў генэральнага агляду

Вестні, якія паступаюць з месц, гавораць аб тым, што генэральны агляд прамысловасьці ўсе больш і больш разгортваецца ў магутную масавую кампанію мабілізацыі рабочых мас на выкананьне задач ударнага кварталу і падрыхтоўку да новага гаспадарчага году.

На цэлым радзе прадпрыемстваў бальшавіцкае кіраўніцтва аглядам забясьпечыла новую хвалю працоўнага ўздыму рабочых, дало ўжо першыя адчувальныя вынікі.

Перадавыя прадпрыемствы БССР адкрылі гонаровы сьпіс ударнага кварталу, датэрмінова выканаўшы свае праграмныя заданьні і сустрэчныя планы, пакрыўшы запазычанасьць другога году пяцігодкі.

Магілёўская маблевая фабрыка імя Хапурына на 18 дзён раней тэрміну выканала свае сустрэчныя, перавысіўшы кантрольныя лічбы на 11 проц. Мядзна-ліцейны цэх заводу «Пралетары» (Гомель) 18 сьнежня таксама поўнасьцю выконаў свае праграмы, дабіўшыся значнага павышэньня прадукцыйнасьці працы. Увесь завод абавязаўся датэрмінова выканаць свае прамфінплян. Два цэхі чэбскай акцыянарнай фабрыкі, пакрыўшы запазычанасьць па мінулым гаспадарчым годзе, вышлі ў рады пераможцаў. Гарбарня «Бальшавік» узяла на сябе абавязацельства выканаць пляны не позьней 28 сьнежня.

Аглядзі выклікаў новы прыбой ударніцтва і спаборніцтва. Новыя калёны ўдарнікаў трэцяга году пяцігодкі ўступілі ў рады барацьбітоў за рэвалюцыйныя тэмпы, за ліквідацыю прарываў, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну як па колькасных, так і па якасных паказьніках. Сотні новых ударных брыгад, сотні добраахвотнікаў па ліквідацыі ўнутрызаводзкіх непаладак, сацыяльныя брыгады ўзорнай арганізацыі, паходы за ажыцьцяўленьне рабочага прапаноў — вось чым адзначыліся ўключэньне ў генэральны агляд рабочыя і заводы.

Аглядзі адначасова агляд выявіў і слабыя бакі нашай работы, неправаротлівасьць пасобных партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый, няўмоўнае па-баявому кіраваць работай.

Сьпалучэньне з уключэньнем у агляд многіх прадпрыемстваў гаворыць аб тым, што яшчэ ня ўсюды навучыліся хутка перастройваць сваю работу, у час пераступіць тыя новыя мэтады мабілізацыі мас, якія высоўваюцца сёньняшнім днём, якія дапамагаюць сканцэнтраваць увагу на рашаючым напрамку. Няўмоўнае ўкапіцца за агляд, як за асноўную, за важнейшую форму барацьбы за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну на даным адрэзку часу, на жаль, было не адзіночным.

Нельга не адзначыць, што ініцыятыва ўдарнікаў пасобных прадпрыемстваў на заўсёды і ня ўсюды з патрэбнай шырынёй падхапляецца. У гэтых адносінах вельмі характэрны факт, што ў гэтага часу мы яшчэ ня маем ніводнага прадпрыемства Менску і Гомелю, а выклік віцебскіх ударнікаў на лепшае правядзеньне агляду, на дасканаленьне скансмоўнае праграм ударнага кварталу і складаньне максымальных сустрэчных прамфінпляну.

Агляд выяўляе, што арганізацыйныя мерапрыемствы, недахопы апаратурнага кіраўніцтва бальшэ б'юць па прадпрыемствах, часта проста выводзячы іх з шэрэнгі лепшых, як гэта мае месца на Камунары. Усё яшчэ наглядаюцца адносіны да рабочых прапаноў, рацыяналізатарскай работы, мабілізацыі захаваных унутраных рэзэрваў, невыстарчальная увага да пытаньняў барацьбы за якасьць прадукцыі. Дзеяні-дзе (Бабруйская швэйная фабрыка) дзеławая практычная работа падмяняецца непатрэбным шумам, парадняцьцю, якія прыкрываюць простую бязьдзейнасьць. Усё гэта вельмі адбіваецца на пасьпяховасьці работы, тармозіць своечасовае выкананьне заданьняў.

ПА-РАНЕЙШАМУ СЛАБА РАЗЬВІВАЕЦЦА АГЛЯД НА ТРАНСПАРЦЕ. Пакуль што мы маем паведамленьні аб УКЛЮЧЭНЬНІ У АГЛЯД АДНАГО МАГІЛЁЎСКАГА вузла.

Перад партарганізацыямі, прафорганамі і адміністрацыйным кіраўніцтвам прадпрыемстваў стаіць задача — неадкладна зьнішчыць усе недахопы, выяўленыя ў працэсе ходу агляду, не дапусьціць паўтарэньня мёртвых месца памылак, няўхільна разьвіваць нарастаньне тэмпаў работы, стаць на чале новага ўздыму энтузіязму мас, накіраваць яго на штодзённае змаганьне за выкананьне адказных задач ударнага кварталу.

Аднэй з умоў пасьпяховага правядзеньня агляду, якія дапамагаюць барацьбе за прамфінплян, зьяўляецца паляпшэньне рабочага забесьпячэньня.

На гэтым вучастку работы мы маем да гэтага часу сур'ёзьнейшыя недахопы.

Некаторыя кааперацыйныя арганізацыі ня хочуць зразумець сваёй ролі ў вытворстве, усё яшчэ не пазбавіліся погляду на забесьпячэньне, як на крыніцу даходу. Побач з гэтым, маюць месца недапушчальныя факты затаварваньня, што з прычыны непаваротлівасьці тавараправодзячай сеткі пазбаўляе кааперацыю тых магчымасьцяй мабілізацыі сродкаў, якія пры правільнай рабоце маглі-б быць лёгка дасягнуты.

Надзвычай востра стаць пытаньне з арганізацыяй тэхніцы абслугоўваньня рабочага спажыўца. Нераспарадчасьць, безгаспадарчасьць, абломаўшчына усё яшчэ зрываюць справу рабочага харчаваньня, ствараюць непатрэбныя чаргі, пазбаўляюць прадпрыемствы магчымасьці мець добрую сталоўню, добры разьмеркавальнік. Практыка лепшых прадпрыемстваў Саюзу, як, напрыклад, «Электрасілы», прышчапляецца вельмі слаба. Зусім невыстарчальны тыя мерапрыемствы, якія праводзяцца зараз па лініі падрыхтоўкі кадраў для рабочага забесьпячэньня.

Побач з вялізарнымі недахопамі кааперацыйных органаў, трэба адзначыць слабы ўдзел у справе рабочага забесьпячэньня саміх заводзкіх арганізацый і шырокай рабочай грамадзкасьці. З боку партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых органаў на ўнутрызаводзкія пытаньні рабочага забесьпячэньня недапушчальна мала зварачаецца ўвагі, ня прымаюцца самыя элемэнтарныя меры садзейнасьці органам ЦРК.

Рабочая грамадзкасьць таксама ня прыцягнута, як належыць, да актыўнага ўдзелу ў рабоце па забесьпячэньні. Гэта справа нарадка заводзіцца да пробнай гаспадарчай пекі ў адносінах да органаў ЦРК, да спроб абмежаваць праблему рабочага забесьпячэньня чыста спажывецкімі тэндэнцыямі замест неабходнай палітычнай пастаноўкі пытаньня аб непарыўнай сувязі паляпшэньня рабочага забесьпячэньня з выкананьнем прамфінпляну, з барацьбой за якасьць прадукцыі, з барацьбой за ліквідацыю накапленьня незакончаных у працэсе вытворчасьці вырабаў і г. д.

Дзейны масавы кантроль, штодзённая дапамога пралетарскай грамадзкасьці ў справе рабочага забесьпячэньня, прыцягненьне шырокіх мас да адшуканьня магчымасьцяй для паляпшэньня забесьпячэньчай базы, прыняцьце ў гэтых адносінах на сябе канкрэтных абавязкаў, —усё гэта яшчэ далёка невыстарчальна прышчапляецца ў нашай сапраўднасьці.

Вось чаму апублікаваная сёньня АДОЗВА РАБОЧЫХ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ аб складаньні сустрэчных кааперацыйных пляноў набывае выключна важнае значэньне. Масавае абмеркаваньне рабочымі гандальпрамфінпляну кааперацыі, праверка іх рэальнасьці, выяўленьне дадатковых унутраных рэсурсаў і, на аснове гэтага, складаньне сустрэчных кааперацыйных пляноў, забясьпечваемых ня толькі органамі кааперацыі, але і канкрэтнай дапамогай прадпрыемстваў — гэта новая форма барацьбы за паляпшэньне рабочага забесьпячэньня, сапраўднага набліжэньня рабочых мас да актыўнага непасрэднага ўдзелу ў данай справе.

Сустрэчныя кааперацыйныя пляны, высунутыя ўдарнікамі Ленінграду і падтрыманыя менскімі абутнікамі, павінны знайсьці шырокае распаўсюджаньне на ўсіх фабрыках і заводах БССР. Прафсаюзы павінны неадкладна стаць на чале гэтага пачынаньня.

Адначасова трэба з першых-жа момантаў папярэдзіць спробы ператварэньня сустрэчных кааперацыйных пляноў у «тройственную» кандагаворы. СУСТРЭЧНЫЯ КААПЭРАЦЫЙНЫЯ ПЛЯНЫ ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА СВАЯСАБЛІВАЙ ФОРМАЙ РАБОЧАГА КАНТРОЛЮ І ДАПАМОГІ ГРАМАДЗКАСЬЦІ КААПЭРАЦЫІ ДЛЯ ПАЛЯПШЭНЬНЯ РАБОЧАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ, АЛЕ ЯНЫ НІЯКІМ ЧЫНАМ НЕ ПАВІННЫ ПАРУШАЦЬ ПРЫНЦЫПАЎ КАЛЕКТЫЎНЫХ ДАГАВАРОЎ, ЯКІЯ ЗАСТАЮЦЦА ДВУХБАКОВЫМІ.

Вопыт ленінградзкіх рабочых павінен стаць магутнай зброяй у барацьбе за паляпшэньне рабочага забесьпячэньня.

Ход генэральнага агляду прамысловасьці навочна сьведчыць аб невычарпальных творчых сілах рабочае клясы, аб яе непахіснай волі, перамагаючы цяжкасьці росту і падкопы шкоднікаў, ажыцьцяўляць баявы лозунг «Пяцігодка —за чатыры гады».

Факты датэрміновага выкананьня прамфінпляну, якія ўжо ёсьць зараз, усё больш узрастаючая энэргія і настойлівасьць рабочых мас у барацьбе за кожны процант заданьня, няўхільны рост вышэйшых форм спаборніцтва,—усё гэта зьяўляецца першым адказам на спробы шкоднікаў і інтэрэвэнтаў сарваць наша сацыялістычнае будаўніцтва, лепшым адказам ныцікам з апартуністычнага лягеру і фракцыянэрам з правага «лявацкага» блёку, лепшым доводам прапільнасьці генэральнай лініі партыі ды поўнай рэальнасьці ўзятых тэмпаў.

Няўхільна разьвіваючы сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце, апіраючыся на творчую ініцыятыву найшырэйшых мас рабочае клясы, зьмятаючы са свайго шляху апартуністаў — гэтых агентаў клясава-варожых элемэнтаў, — партыя ўпэўнена павядзе краіну па шляху новых перамог у рашаючы год пяцігодкі, забясьпечыць поўнае выкананьне вызначаных планаў.

Голас мільёнаў

Ніякім контр-рэвалюцыйным сілам ня спыніць сацыялістычнага будаўніцтва

Пашыраны пленум Казлоўскага і Чэрнінскага сельсаветаў з абураньнем ганьбіць контр-рэвалюцыйную работу беларускіх нацыянал-дэмакратаў — Ластоўскіх, Лёсінаў, Краскоўскіх, Смолічаў і інш.

У адказ на шкодніцкую дзейнасьць беларускіх нацдэмаў, яшчэ цясьней згуртуемся вакол партыі Леніна, для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Вёска Рудня, Казлоўскага сельсавету, пастанавіла арганізаваць чырвоны абоз і калгас.

— Працаўнікі Беларускага, польскага і яўрэйскага дзяржаўных вандроўных тэатраў, заслухаўшы на абъяднаным сходзе інфармацыю аб шкодніцкай дзейнасьці беларускай контр-рэвалюцыйнай нацыянал-дэмакратычнай групы, вітаюць вярнага вартаўніка завяваньняў Кастрычніка — ДПУ Беларусі і адначасова патрабуюць найлепшай меры пакараньня для усіх групы контр-рэвалюцыянэраў.

Калектыў лічыць, што ніякія контрэвалюцыйныя сілы ня спыняць сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне.

Мы, працаўнікі вышэйпамянёных тэатраў—працаўнікі культурнага фронту, запэўняем савецкі ўрад і кампартыю, што будзем весьці самую рашучую барацьбу з усімі правымі нацдэмакратызму, вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, а таксама з шавінізмамі ўсіх іншых нацыянальнасьцяй.

Мы абавязваемся з яшчэ большай энэргіяй і энтузіязмам узяцца за выкананьне і перавыкананьне вытворча-эканамічнага пляну.

— Агульны адкрыты сход ячэйкі КП(б)Б Наркамасьветы супольна з працаўнікамі Наркамасьвіты, Беларускай Дзяржаўнай Бібліятэкі і студэнцтвам дашкольнага тэхнікуму выказвае сваё абурэньне контр-рэвалюцыйнай дзейнасьцю групы беларускіх нацдэмаў і патрабуе для іх найвышэйшай меры пакараньня.

Агульны сход абяцае прыкладыць усе свае сілы да таго, каб у кучэйшы тэрмін пазбавіць родзічы нацдэмаўшчыны ў культурна-асьветных установах, выдучы адначасова згодзенную і бязлітасную барацьбу з шавінізмамі іншых колераў і вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе.

У адказ на шкодніцкую дзейнасьць беларускіх нацдэмаў асьветнікі абяцаюць яшчэ цясьней згуртаваць свае рады вакол партыі Леніна і яе ЦК для пасьпяховага выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Агульны сход вітае і цалкам далучаецца да пастановы Кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б, які абвяшчае нацыянал-апартуністычныя погляды несумяшчальнымі з прабываньнем у радах партыі, і заклікае ўсіх членаў партыі да рашучай і бязлітаснай барацьбы з нацыянал-апартуністамі, гэтымі нацдэмамі з партбілетамі ў кішэні і прымірэнцамі да нацыянал-дэмакратызму.

Калектыў асьветнікаў шле гарачае прыўітаньне вернаму вартаўніку пралетарскай дыктатуры — ДПУ Бел. і лічыць необходным надаць Менскаму беларускаму педтэхнікуму імя да апошняга часу нашу імя нацыянал-апартуніста Ігнатоўскага — імя ДПУ Беларусі.

Агульны сход далучаецца да пастаноў рабочых сходаў аб узнагародзе ДПУ Беларусі ордэнам Леніна.

— Мітынг дэлегатак — работніц, калгасьніц і жонак рабочых заводу «Чырвоны Кастрычнік» з абурэньнем пратэстуе супроць контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці выкрытай ДПУ групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў. Контр-рэвалюцыйная дзейнасьць буржуазнай інтэлігэнцыі, былых міністраў, якія ў свой час далі шырокае абвяшчэньне пралетарскай дыктатуры на справе дапамагаць набудове сацыялізму, фактычна была накіравана на арыў выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, на арыў сацыялістычнага будаўніцтва, на зьнішчэньне Савецкай Беларусі і ператварэньне яе ў калёнію польскага фашызму.

У адказ на шкодніцкую дзейнасьць беларускіх нацдэмаў яшчэ больш згуртуем свае рады вакол камуністычнай партыі. Шляхам актывізацыі наведваньня парткласы, гурткоў бягучай палітыкі і школы па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, узмоцнім палітычную складамасьць і ліквідуем няпісьменнасьць і малапісьменнасьць, ленінцы дэлегатак — работніц, калгасьніц і жонак рабочых перадамо ў рады партыі і падрыхтуем іх на кіруючыя пасады.

Агульны сход дэлегатак хадайнічае аб узнагародзе ДПУ Беларусі ордэнам Леніна.

— Канфэрэнцыя батракоў, беднаты і калгасьнікаў Аршанскага раёну з вялікім абурэньнем ганьбіць выкрытую ДПУ контр-рэвалюцыйную групу беларускіх нацыянал-дэмакратаў і патрабуе для ўсіх яе ўдзельнікаў вышэйшай меры пакараньня.

Далейшая калектывізацыя вёскі, пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне ільназагатовак, узмоцненьне абароназдольнасьці краіны — вось наш адказ на агідныя замыслы крывавых сабак буржуазіі.

Канфэрэнцыя шле шчырае прывітаньне баявому органу пралетарскай дыктатуры — ДПУ Бел. і патрабуе ўзнагароды ордэнам Леніна.

Сьмерць контр-рэвалюцыянэрам — Лёсінаў, Ластоўскім, Смолічам, Краскоўскім і К-о — агентам польскага фашызму.

— Заслухаўшы інфармацыйнае паведамленьне аб арышце беларускіх контр-рэвалюцыянэраў — нацдэмаў, агульны перавыбарчы сход вёскі Белка разам з калгасам «Гігант», Петрыкаўскага раёну, патрабуе для шкодніцкіх і агентаў польскага фашызму вышэйшай меры пакараньня.

У адказ на шкодніцкую дзейнасьць контр-рэвалюцыянэраў беларускіх нацдэмаў мы пад кіраўніцтвам партыі Леніна, з яшчэ большым энтузіязмам будзем працаваць на сацыялістычным будаўніцтве, па ўзмацненьні сацыяльнай калектывізацыі і на гэтай базе ліквідацыі кулацтва, як класы.

Сход пастанавіў правесьці дадатковую падпіску на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады».

— Настаўнікі, калгасьнікі, беднота і сераднякі Сьмятаніцкага сельсавету, Петрыкаўскага раёну, патрабуюць ад ураду самай жорсткай кары для контр-рэвалюцыянэраў — беларускіх нацыянал-дэмакратаў.

Мы — настаўнікі і працоўныя сяляне — вітаем вернага вартаўніка Кастрычніцкіх завяваньняў — ДПУ Бел. і патрабуем узнагароды ордэнам Леніна.

У адказ на шкодніцкую работу беларускіх нацдэмаў настаўніцтва дадатковa падпісваецца на пазыку «Пяцігодка —за чатыры гады» на 25 проц., а сяляне, якія прысутнічалі на сходзе, — на 110 руб.

Неапублікаваны ўрывак з артыкулу Леніна

МАСКВА. Інстытут Леніна падае неапублікаваны ўрывак з артыкулу Леніна «РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРМІЯ і РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ЎРАД».

«Сацыял-дэмакратыя ніколі не глядзела і не глядзіць на вайну з сантыментальнага пункту гледжаньня. Беспаваротна асуджаючы войны, як зьверскія спосабы вырашэньня спрэчак чалавецтва, сацыял-дэмакратыя ведае, што войны няўнікнёны пакуль грамадзтва падзяляецца на клясы, пакуль існуе эксплёатацыя чалавека чалавекам. А для зьнішчэньня гэтай эксплёатацыі нам не абыйсьціся без вайны, якую пачынаюць заўсёды і ўсюды самі эксплёатуючыя, пануючыя і прыгнятаючыя клясы. Ёсьць вайна і вайна. Ёсьць вайна — авантура, якая здавальняе інтарэсы дынастыі, апэтыты грабежніцкай шайкі, мэты гэроляў капіталістычнай нажывы. Ёсьць вайна — і гэта адзіная законная вайна ў капіталістычным грамадзтве — супроць прыгнятальнікаў народу. Толькі ўтапісты ці філістэры могуць прынцыпова асуджаць такую вайну. Толькі буржуазныя здрадні свабоды могуць стараніцца цяпер у Расіі ад гэтай вайны, вайны за волю народу. Пралетарыят пачаў у Расіі гэту вялікую вызваленчую вайну. Ён здолее весьці яе далей, ствараючы сам атрады рэвалюцыйнай арміі, падмацоўваючы атрады перайшоўшых да нас салдат ці матросаў, прыцягваючы сялян, капаўлючы новых грамадзян Расіі, якія фармуюцца і загартоўваюцца ў агні грамадзянскай вайны, гэройствам энтузіязмам змагароў за свабоду і шчасьце ўсяго чалавецтва».

Артыкул «РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ АРМІЯ І РЭВАЛЮЦЫЙНЫ ЎРАД» быў напісан Леніным у першых числах ліпеня 1905 году ў сувязі з паўстаньнем на браняносцы «Потемкин».

Гэта вытрымка з артыкулу была ў рукапісе выкрэсьлена, магчыма, ў парадку скарачэньня артыкулу з-за недахвату месца ў газэце «Пролетарий», дзе артыкул быў надрукаваны ў нумары 7 ад 10 ліпеня (27 чэрвеня) 1905 году (збор твораў том VII, стар. 379-387).

Гэты ўрывак мае самастойнае значэньне і прадстаўляе вялікую цікавасьць для сучаснасьці. Ён узяты з сэрыі дакумантаў і матар'ялаў за 1905 год, якія друкуюцца ў 17 ленінскім зборніку, што выходзіць гэтымі днямі.

Урад Стэга атрымаў большасьць у ...7 галасоў

Няўстойлівасьць новага францускага габінэту

ПАРЫЖ, 19. Урадавы крызіс вырашаны. Учора вечарам у палаце ўрад пасьля абмеркаваньня дэкларацыі атрымаў большасьць усяго толькі 7 галасоў. 291 голас быў паданы за ўрад, 284 — супроць. У сваёй дэкларацыі ўрад указвае, што ён «будзе імкнуцца да устанаўленьня ўнутранога палітычнага міру» і «працавіцца ўмяшаньню фінансавых сіл у палітычнае жыцьцё краіны». У замежнай палітыцы ўрад будзе настойваць на арганічнай рабоце ў галіне эканамічнага і маральнага міжнароднага жыцьця», будзе дабівацца адначасовага правядзеньня прынцыпаў арбітражу, бясьпечнасьці і разбраеньня. Тым ня менш урад мае намер забясьпечыць «дзёльнае ажыцьцяўленьне і максымальную эфэктыўнасьць закону аб гадавым тэрміне вайсковай службы».

Урад далей абяцае напружыць усе сілы, каб «перамагчы патражаючы эканамічны крызіс» шляхам правядзеньня адпаведнай сельска-гаспадарчай і каленіяльнай палітыкі. Урад абяцае ўжыць меры да абмежаваньня інтарэсаў дробных укладчыкаў ад спэкуляцыі і забясьпечыць бюджэтную роўнавагу без увядзеньня новых падаткаў. У заключэньне ўрад заклікае ўсе партыі да адзінства.

У спрэчках пасьля прамовы Эрыё, які падкрэсьліў, што «вялізную адказнасьць узяў-бы на сябе той, хто імкнуўся-б сарваць спробу стварэньня ўраду канцэнтрацыі», выступіў кіраўнік рэспубліканска-дэмакратычнага саюзу Мэрэн, які заявіў, што «цяперашні ўрад зусім не адпавядае большасьці парляманту, выбранага народам: «Стварэньне ўстойлівага ўраду далёка больш небясьпечна, чым скінуць той ці іншы ўрад». У заключэньне, звараючыся да сацыялістаў з запытаньнем, чаму яны ня выступаюць адкрыта на трыбуне, каб выгдумачыць матывы, па якіх яны гатовы падтрымліваць урад, мэрэн заклікае «большасьць галасаваць супроць ураду».

У гарнісіць ураду галасуе пераважная большасьць радыкал -сацыялістаў, «рэспубліканскіх сацыялістаў», «левых радыкалаў». Назначная большасьць 7 галасоў, сабраных урадам, разгледаецца ў палітычных колах, як бясспрэчная адзнака надзвычайнай слабасьці і няўстойлівасьці ўраду Сэга.

СУСЬВЕТНЫ ЭКАНАМІЧНЫ КРЫЗІС РАСЬЦЕ

НОВЫЯ СОТНІ ТЫСЯЧ РАБОЧЫХ ВЫКІДВАЮЦЦА НА ВУЛІЦУ

Звыш 500.000 беспрацоўных у фашысцкай Італіі

РЫМ, 17. Паводле афіцыяльных даных, лік беспрацоўных у Італіі на 1-е сьнежня дасягнуў 534 чал. Такім чынам, лік зарэгістраваных беспрацоўных на 88.000 перавысіў лік зарэгістраваных у мінулым месяцы. З агульнага ліку зарэгістраваных карыстаецца дапамогай толькі 142.000 беспрацоўных.

Бязупынны рост беспрацоўя у Нямеччыне

БЭРЛІН, 19. Паводле статыстычных даных агульна-нямецкага аб'яднаньня прафсаюзаў (рэфармісцкіх), беспрацоўе сярод членаў прафсаюзаў узрасло амаль ва ўсіх галінах прамысловасьці. Асабліва вялікае беспрацоўе сярод членаў саюзу будаўнікоў, дзе лік беспрацоўных цесьлярноў складае 56 проц., каменьщёсаў—53,2 проц., крытцоў—42,5 проц. і сярод рабочых керамічнай прамысловасьці—49,4 проц. У саюзе мэталістаў лік беспрацоўных узрос з 23,9 проц. у кастрычніку да 25,5 проц. у лістападзе. У саюзе тэкстыльшчыкаў лік беспрацоўных узрос з 18,2 проц. да 19,6 проц., у саюзе шаўцоў—з 22,1 проц. да 25,5 проц. і г. д. Адначасова павялічыўся процант часткова беспрацоўных, г. зн. занятых няпоўны час. Так, у мэталапрамысловасьці лік такіх беспрацоўных павялічыўся з 24 да 25,6 проц., у тэкстыльнай з 38 да 43, а ў абутковай з 47 проц. да 56,8.

Агульна-нямецкае аб'яднаньне прафсаюзаў у выніку праведзенага абсьледваньня вымушана прызнаць, што мэтад скарачэньня рабочага часу з мэтаю ўцягнуць большую колькасьць рабочых у прамысловасьць ня даў здавальняючых рэзультатаў.

Мільёны беспрацоўных у Англіі

ЛЕНДАН, 17. Лік зарэгістраваных беспрацоўных на 8 сьнежня ў Англіі складаў 2.306.962. Колькасьць беспрацоўных параўнальна з мінулым тыднём, павялічылася на 1.323, а ў параўнаньні з мінулым годам—на 997.456 чал.

СЛОВЫ І СПРАВЫ ЖЭНЭЎСКІХ „МІРАТВОРЦАЎ"

Узмоцненая матарызацыя амэрыканскай арміі

ЛЕНДАН. Як падае «Дэйлі Тэлеграф», амэрыканскі генэрал Фугуа ў прамове, якую ён зрабіў у вышэйшым вайсковым вучылішчы ПАЗШ, указаў, што амэрыканская армія ў сучасны момант мае 1047 танкаў, значна перавышае ў гэтых адносінах англійскую армію. Генэрал Фугуа ўказаў таксама, што ў апошні час ўзмоцнена праведзіцца матарызацыя армі ПАЗШ.

Банкруцтва 18 банкаў у Амэрыцы

НЬЮ-ЕРК, 18. Яшчэ 18 банкаў спынілі плацяжы, у тым ліку 12 у штаце Аркамзас. Тры банкі ў штаце Паўночная Каралінa, адзін у штаце Кентукі, адзін у штаце Індыянаполіс і адзін—у штаце Огайо.

МІЛЬЯРДЫ

НА ПАДРЫХТОЎКУ ВАЙНЫ СУПРОЦЬ СССР

ВЕНА, 11. Згодна паведамленьня з Букарэсту, правядзеньне новага румынскага бюджэту на 1931 год натыкнулася на «нечаканыя» труднасьці. Францускі дарадца румынскага нацыянальнага банку Оуэн, які вярнуўся з Парыжу, заявіў рашучы пратэст з поваду таго, што выдаткі па бюджэце фактычна перавышаюць даходы і патрабуюць скарачэньня бюджэту на меншай меры на паўтара мільёна лей (лея,—1,1 кап.).

Уся прэсрмысьць афіцыяльнага дзяржбюджэту пацьвярджаецца пастаўленьнем рэгацыянэра Аверэску—лідэра народнай партыі, які, заявіў, што ўвесь бюджэт—«скандальная хлусьня», што сапраўдная сума бюджэту ня 32,5 мільярду лей, а на меншай меры 60 мільярдаў. Фармальна ня фігуруючыя ў бюджэце сумы трэба шукаць, паводле слоў Аверэску, у так званых «аўтаномных» тайных бюджэтах. Выкрыцьці Аверэску сьведчаць аб тым, што румынскі ўрад мае ў сваім распараджэньні пазабюджэтныя тайныя фонды для ўзмацненьня ўзбраеньня.

Жудасны малюнак усеукраінскага пагрому ў фашысцкай Польшчы

Паліцэйскія грамілы кідалі палатно, харчы, зьмешваючы іх з пер'ем з падушак, і аблівалі газаю

Па 300 палачных ударах

ВАРШАВА, 18. Усё больш шырокія разьмеры набывае берасьцейскі скандал. Следам за вымушаным запросам попэсэўцаў і нацыянал-дэмакратаў а поваду Берасьця паступілі пратэсты і іншых колаў. Надзвычай няпрыемным для ўраду зьяўляецца пратэст прафэсараў кракаўскага ўнівэрсытэту. Паваг блізкіх да ўраду органы друку, як «Экспрэс Поранны», «Кур'ер Цодзенны» і «Кур'ер Поранны» вымушаны былі загаварыць аб неабходнасьці пакараньня вінаватых. У гэтай заяве вельмі многа двурушніцтва, бо ні для каго не сакрэт, хто пасьлаў і хто даваў інструкцыі афіцэрам, якія зьдзекаліся ў Берасьці над зьняволенымі.

Апрача Берасьця зноў успыхнае пытаньне аб так званым «уціхамірваньні» Заходняй Украіны. Пытаньне да таго-ж стаіць на парадку дня чарговай сэсіі рады Лігі Нацый. Украінскі клюб унёс запрос у сэйм. Запрос складаецца з 83 старонак і выяўляе надзвычай выключны на жорсткасьці малюнак масавага украінскага пагрому ў Польшчы. У запросе падаюцца дакумантальныя даныя аб масавых зьбойствах, разгроме кааператываў, школ і г. д. Падана вялікая колькасьць пратаколаў асьбістага апытаньня зьбітых і катаваных украінскіх сялян; якія атрымалі па 300 і больш палак. Зьмешчаны пратакольныя даныя аб тым, як паліцэйскія грамілі сялянскія хаты, зьнішчалі ўсё, што знаходзілі ў гэтых хатах, кідалі палатно, харчовыя прадукты, зьмешваючы іх з пер'ем падушак і паліваючы газай. Апісаны шматлікія выпадкі спагнаньня кантрыбуцыі, бесчалавечныя зьлёкі і жудасны малюнак сьмяротнага страху, якім было апоўнена насельніцтва, якое хавалася цэлымі тыднямі ў лясох. Гэта сумная кніга — дешчы камэнтары да ўсіх абвяржэньняў польскага каёйнага друку і артыкулаў пенатовых апалагетыкаў замежных журналістаў, якія, пабываўшы ў Заходняй Украіне ў часе экзэкуцый, напісалі ў свае газэты, што яны нічога там дрэннага не заўважылі.

Пастаўлена таксама ў сойме пытаньне аб фальсыфікацыі выбараў. Усе прадстаўнікі апазыцыі, выступаўшыя на першым пасяджэньні сойму, адкрыта з трыбуны заявілі, што цяперашні склад сойму зьяўляецца рэзультатам падрыхтоўкі жахлівага тэрору ды насельніцтва і дапушчаных злоўжываньняў на выбарах. Пры гэтым ня трэба забываць, што апазыцыя, якая ўзьняла гэтыя пытаньні, ведома сваім двурушніцтвам і схіляньнем да ўсіх закулісных зьдзелак з пісудчыкамі.

На пасяджэньні берасьцейскага пытаньня, камуністычны дэпутат Бужынскі, як паведамляўся ўжо, крыкнуў з месца што ў польскай дэфэнзыве зьбіваюць папітычных зьняволеных сыстэматычна працягу 12 год. Ліцэйні ілюстрацыяй да гэтай заявы можа паслужыць ня фармацыя бундаўскага «Фольксцэйтунг» аб справе 10-ці украінскіх сялян у тым ліку адной дзяўчынкі, якая (справа) разглядалася у ковельскім акруговым судзе. Амаль усе падсудныя абвінавачваліся ў камуністычнай дзейнасьці. На папярэднім следзьце ў ахранцы амаль усе давалі паказаньні супроць сябе і «сазнаваліся» ў тым, што зьяўляюцца камуністамі. Тым больш пікантнай была заява аднаго з падсудных, сепяніма Оліха, які пераказаў суду пасьведчаньне, што ён зьяўляецца нічым іншым, як упаўнаважным... беспартыйнага блёку. Ён заявіў на судзе што ніколі камуністам ня быў, але пад'ў дэфэнзыве ён сапраўды прызнаў сябе камуністам, бо яго бесчалавечча мучылі і катавалі. Оліх спасылаўся пры гэтым на пратакол доктара, які вывіхсьлады пабояў на ўсім целе і на пашкоджаных органах. Іншыя абвінавачаныя заявілі на судзе, што «сазналіся» ў сваёй «шпіёнатасьці» пры тых-жа абставінах і былі настолькі тэвярызаваны што не адважваліся расказаць аб зьбойствах сьледчаму, баючыся новых мучэньняў і катаваньняў.

Прыхільніка беспартыйнага блёку сапраўдаў. Усе іншыя прыгавораны да 4-х год катаржнай турмы кожны.

У Сасноўцы адбылася шматлюдная дэманстрацыя беспрацоўных, на якую два разы нападала паліцыя. Дэманстранты аказалі паліцыі актыўнае супраціўленьне. Некалькі беспрацоўных арыштаваны на абвінавачаньні ў камуністычнай агітацыі.

Бюджэт вайсковага міністэрства—недатыкальны

Сойм распушчан на канікулы

ВАРШАВА, 18. Сайм распушчан на кароткія сьвяточныя канікулы. Але ўжо перад роспускам, ня гледзячы на ўсю спакойнасьць апазыцыі, выявіліся ва ўсёй вострасьці няпрыемныя для пісудчыкаў пытаньні. У цэнтры няпрыемных пытаньняў — дзяржаўны бюджэт. Сам дакладчык, міністар фінансаў Матушэўскі, вымушан быў заявіць, што лічба бюджэту надта высокая. Выступаўшы з сур'ёзнай крытыкай бюджэтаў нацыянал-дэмакратычны дэпутат лёгка даказаў яго нерэальнасьць. Аб нерэальнасьці бюджэту гаворыць таксама ўрадавы «Кур'ер Цодзенны». Усе разумеюць, што бюджэт трэба скараціць і што скараціць яго можна толькі ў адносінах вайсковых выдаткаў. Але ўсе таксама добра разумеюць, што міністар Матушэўскі гэта ніядзвуначна падкрэсьліў у сваёй прамове, што бюджэт вайсковага міністэрства недатыкальны.

Сацыял-лёкаі дапамагаюць узбраэньню фашысцкіх банд

ГЭЛЬСЫНГФОРС, 18. У Гэльсінгфорскім муніцыпалітэце абмяркоўвалася пытаньне аб крэдыце ў 500.000 фінскіх марак Шуцкору (клясавая вайсковая арганізацыя буржуазіі). Як паведамляюць газэты, пытаньне было папярэдня ўзгоднена наміж фракцыямі. Сацыял-дэмакраты таксама згадзіліся даць крэдыт. Аднак, на пасяджэньне нечакана зьявіліся левыя дэпутаты, якія да гэтага часу не дапускаліся да ўдзелу ў муніцыпалітэце, і патрабавалі адхіленьня крэдыту. Прыпёртыя да сьценкі сацыял-дэмакраты вымушаны былі падтрымаць левых. У рэзультаце Шуцкору дан крэдыт толькі ў суме 200.000 фінскіх марак. Але паведамленьня аб прысутнасьці левых дэпутатаў на пасяджэньні фашысты зьявіліся ў муніцыпалітэт і зрабілі паўдалую спробу сарваць пасяджэньне і захапіць левых дэпутатаў.

Сяўнаму вартаўому пралетарскай рэвалюцыі —АДПУ з дзесяцігадовым юбілеем

Прывітаньне тав. Галадзеда

Сяўнаму вартаўому Кастрычніцкай пралетарскай рэвалюцыі — ДПУ і яго перадавому атраду — пагранвойскам гарачае бальшавіцкае прывітаньне і прызнаньне заслугаў з 13 гадовага органаў ВЧК — ДПУ і з дзесяц

Перабудова партработы на вытворчасьці— зарука пасьпяховага выкананьня прамфінпляну

Па-бальшавіцку забясьпечыць поўны паварот прафсаюзаў тварам да вытворчасьці, бязьлітасна выкарчоўваючы апартуністычную практыку

Месячнік праверкі беларусізацыі і работы сярод працоўных нацменшасьцяў

Неадкладна зьнішчыць недахопы ў правядзеньні месячніка

Мабілізаваць працоўныя масы на далейшую ўпартую барацьбу з вялікадзяржаўным шавінізмам—галоўнай небясьпекай, з агентурай польскага фашызму—беларускім нацыянал-дэмакратызмам, шавінізмамі ўсіх колераў і прымірэнцтвам да іх.

Сёньня мы зьмяшчаем пастанову ЦК КП(б)Б аб ходзе месячніка праверкі беларусізацыі і работы сярод працоўных нацменшасьцяў. ЦК КП(б)Б асабліва падкрэсьлівае, што: «уся работа па правядзеньні месячніка беларусізацыі яшчэ зусім слаба разгорнута ўсімі партыйнымі і асабліва прафсаюзнымі арганізацыямі. Задачы, вызначаныя для ажыцьцяўленьня ў часе месячніка, у значнай меры выконваюцца фармальна і без выстарчальнага прыцягненьня шырокіх мас рабочых, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства»

«Зьвязда» ў сваіх артыкулах ужо прыводзіла ўзоры фармальна-бюракратычных адносін да выкананьня важнейшых дырэктыў партыі. Мы сыгналізавалі канкрэтнымі фактамі перад партыйнай арганізацыяй, што тэмпы падрыхтоўкі і сама работа па правядзеньні месячніка ў значнай частцы партыйных арганізацый праходзіць яўна нездавальняюча. ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове з усёй бальшавіцкай рашучасьцю падкрэсьлівае тыя недахопы і прарывы, якія маюць месца ў правядзеньні месячніка праверкі беларусізацыі і вызначае рад канкрэтных мерапрымстваў па іх зьнішчэньні, на далейшай упартай рабоце партыйнай арганізацыі на гэтым надзвычай важным палітычна адказным вучастку.

Сёньня мы таксама сыгналізуем, што, як гледзячы на тое, што ўжо прайшло 20 дзён з пачатку правядзеньня месячніка, паасобныя ячэйкі і райкомы зусім зрываюць правядзеньне гэтай работы. Яны абмяжоўваюцца толькі фармальна бюракратычнай адпіскай, складаньнем плянаў, а па сутнасьці нічога ня робяць для таго, каб забясьпечыць выкананьне задач, якія стаяць перад імі.

ДРУК ТАКСАМА СЛАБА ПЕРАКЛЮЧАЕЦЦА НА ВЫКАНАНЬНЕ ЗАДАЧ МЕСЯЧНІКА.

Адным з буйнейшых недахопаў, якія адзначае ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове, зьяўляецца тое, што ў часе самога месячніка СЛАБА РАЗГОРТВАЕЦЦА РАБОТА ПА ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫМ ВЫХАВАНЬНІ працоўных мас.

КУЛЬТ-ЭСТАФЭТА, ЯКАЯ ЗАРАЗ ПРАВОДЗІЦЦА, Ў БОЛЬШАСЬЦІ МЕСЦ НЯ ЎВЯЗВАЕЦЦА З ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ МЕСЯЧНІКА, ШТО ТАКСАМА ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА БУЙНЕЙШЫМ НЕДАХОПАМ ГЭТАЙ РАБОТЫ.

Да сканчэньня месячніка засталося 10 дзён. Партарганізацыі павінны скарыстаць час, які застаўся для таго, каб з усёй бальшавіцкай настойлівасьцю ліквідаваць тыя прарывы, якія адзначаны ў пастанове ЦК КП(б)Б.

Большасьць цэнтральных праўленьняў саюзаў ня кіруе і ня прымае ўдзелу ў правядзеньні месячніка. Значная частка прафсаюзаў абмежвалася ў лепшым выпадку толькі тым, што разаслала на месцы ўказаньні аб удзеле масавых арганізацый у правядзеньні гэтай работы і не прыняла ніякіх мер для таго, каб правярыць выкананьне ніжэйшымі арганізацыямі даных дырэктыў. Тут патрэбен рашучы і карэнны пералом.

**Клюбы, кіно, тэатры, радыё, бібліятэкі і наогул усе культасьветныя ўстановы павінны навярстаць упушчанае. Траба разгарнуць шырокую работу па папулярызацыі перад шырокімі масамі працоўных палітычных задач месячніка. На канкрэтных фактах работы па правядзеньні месячніка зваастраць увагу працоўных. Перадаваць практыку лепшых, падцягваць адстаючых — вось асноўныя задачы, якія стаяць перад гэтымі арганізацыямі. Як калі не антыпартыйнай недавацэнкай задач месячніка, можна кваліфікаваць тое, што дзяржаўная бібліятэка, а па прыкладзе яе і ніводзін бібліятэкі, кіно, часткова і радыё, да гэтага часу нічога не зрабілі дый, да гэтага часу нічога не зрабілі. Гэтае — ня ў апошнюю чаргу — і таго, каб падабраць рэкамандаваньні для таго, каб падабраць рэкамандаваньні для таго, каб у часе месячніка пакары і г. д., каб у часе месячніка пакары і г. д., каб у часе месячніка пакары і г. д.,

3-я СЭСІЯ ЦВК БССР IX СКЛІКАНЬНЯ

АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ РАБОТ СЭСІІ



Заключная прамова старшыні ЦВК БССР т. А. Г. ЧАРВЯКОВА на закрыцьці сэсіі

Значэньне працы III сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР вынікае з таго, што яна была склікана напярэдадні 3-га году—рашаючага году пяцігодкі, у перыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы ўнутры савецкай краіны і ўзмоцненай падрыхтоўкі з боку капіталістычных дзяржаў да інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу.

У зьвязку з гэтым усе пытаньні парадку дня сэсіі разглядаліся намі з пункту гледжаньня найлепшай падрыхтоўкі і мабілізацыі сіл да пасьпяховага выкананьня задач гэтага 3-га году пяцігодкі, далейшага разгортваньня сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце, ліквідацыі рэштак капіталізму і рашучага адпору імпэрыялістычным інтэрвэнтам.

Канкрэтныя задачы далейшага сацыялістычнага будаўніцтва вызначаны сэсіяй ЦВК у кантрольных лічбах і дзяржаўным бюджэце на 1931 г. Пры складаньні гэтых плянаў урад БССР выходзіў з неабходнасьці мабілізаваць усе рэсурсы, каб захаваць і павялічыць дасягнутыя Савецкай Беларусьсю, пры дапамозе Савецкага Саюзу, бальшавіцкія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта ўстаноўка ўраду атрымала поўнае падтрыманьне з боку рабочае клясы і шырокіх працоўных мас БССР, якія праз свой вышэйшы савецкі орган дыктатуры пралетарыяту — Цэнтральны Выканаўчы Камітэт — ухвалілі пастановы ўраду.

У выніку гэтага бюджэт будучага году павялічваецца на 65 проц., прычым галоўная частка бюджэту ідзе на фінансаваньне народнай гаспадаркі, у мэтах далейшага разгортваньня работы па індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі шляхам будаўніцтва саўгасаў і калгасаў.

Разам з гэтым зьвернута ўвага на далейшае разгортваньне сацыяльна-культурных мерапрыемстваў, дзеля чаго асигнаваньні павялічваюцца амаль у два разы. У той-жа час вызначана скарачэньне адміністрацыйных выдаткаў. Гэтыя меркаваньні будуць удасканальвацца шляхам узгодненьня іх з плянамі Савецкага Саюзу, але асноўны зьмест і напрамак вызначаных намі мерапрыемстваў застаецца. Аднак, трэба ўлічыць, што выкананьне гэтых плянаў патрабуе напружанай работы па мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў Савецкай Беларусі, сацыялістычнай арганізацыі працы і захаваньня бальшавіцкіх тэмпаў, з прычыны чаго ЦВК, ухваліўшы пляны, у той-жа час зьвярнуўся да рабочае клясы і ўсіх працоўных, а таксама ўсіх савецкіх установ і арганізацый з заклікам усімі сіламі садзейнічаць пасьпяховаму выкананьню гэтых плянаў. Далейшае разгортваньне творчай ініцыятывы рабочых, калгасьнікаў, бядняцка - серадняцкага сялянства і ўсіх працоўных праз разгортваньне сацспаборніцтва, ударніцтва, сустрэчных прамфінплянаў, шырокае разгортваньне пралетарскай самакрытыкі, рашучай барацьбы супроць шкодніцтва, рвацтва, упадніцкіх настроеў, павінны служыць зарукай выкананьня гэтых задач.

Мы маем усе магчымасьці для выкананьня вызначаных плянаў і наперакор усім панікёрскім заявам правых і іншых апартуністаў, якія зьяўляюцца кулацкай агентурай унутры партыі, мы ўсе гэтыя пляны выканаем, даючы самы рашучы адпор усім кулацкім агентам.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт асабліва выдзеліў і абгаварыў пытаньне аб далейшых задачах калектывізацыі. Рашучы паварот асноўных мас серадняцкага сялянства сьледам за беднатой да сацыялізму праз калектывізацыю патрабуе пастаяннай увагі і выразнай працы з боку саветаў, якія павінны стаяць на чале калектыўнага руху, якія павінны быць арганізатарамі гэтага руху і ліквідацыі на базе суцэльнай калектывізацыі кулацтва, як клясы.

Мы адзначылі вельмі значныя посьпехі ў справе калектывізацыі за мінулы час. Усе папярэднія меркаваньні аб калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак намі значна перавыкананы. Гэта служыць моцнай падставай для далейшага разгортваньня шырокага калгаснага руху і прывядзе нас да суцэльнай калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.

Вялікасьць задачы ў справе калектывізацыі вынікае з таго, што на падставе магутнага руху бядняцка - серадняцкіх мас у калгасы міяркуецца ахапіць да канца 1931 году да 45 проц. усіх бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.

Вось з гэтае прычыны Цэнтральны Выканаўчы Камітэт, даючы агульнае паказаньне аб далейшых задачах калектывізацыі, у той-жа самы час зварачае ўвагу ўсіх установ і арганізацый на неабходнасьць самых уважлівых адносін да працы і жыцьця кожнага калгасу, выходзячы з таго, што добрая пастаноўка працы ў кожным калгасе зьяўляецца найлепшым прыкладам і агітацыяй за далейшае ўзмацненьне калгаснага руху.

У зьвязку з неабходнасьцю праверкі таго, як ідзе прыстасаваньне нашага апарату да вырашэньня задач рэканструкцыйнага перыяду, абгаварвалася пытаньне і вызначан рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні раённага і сельскага апаратаў.

Тав. Сталін, кажучы на XVI зьезьдзе ВсесКП(б) аб пераходзе на раённую сыстэму кіраўніцтва, даў наступную ацэнку гэтаму мерапрыемству:

«Ня можа быць сумненьня, што мы-б ня здолелі ўзьняць вялізарную работу па перабудове сельскай гаспадаркі і разьвіцьці калгаснага руху, калі-б не правялі раёнаваньня».

Вось чаму і ў далейшым неабходна, згодна пастаноў Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, неаслабная ўвага да гэтага пытаньня з боку цэнтральных і мясцовых установ, каб давесьці да канца справу набліжэньня апарату да раёну і вёскі.

Важнейшае значэньне мае пастанова ЦВК аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. Гэта кампанія павінна быць шчыльна зьвязана з правядзеньнем усіх чарговых палітычна-гаспадарчых кампаній і садзейнічаць іх пасьпяховаму выкананьню.

Увага ўсіх савецкіх, грамадзкіх і іншых пралетарскіх арганізацый, актыўнасьць рабочых, бядняцка -серадняцкага сялянства, калгасьнікаў і ўсіх працоўных павінна быць мабілізавана на тое, каб дабіцца найлепшых вынікаў гэтай кампаніі.

Праз справаздачна - перавыбарчую кампанію мы павінны ўзьняць ролю саветаў у барацьбе за генэральную лінію партыі, ажывіць іх дзейнасьць, як масавых арганізацый, павярнуць тварам да вырашэньня задач сацыялістычнага будаўніцтва рэканструкцыйнага перыяду, як сапраўдных баявых органаў дыктатуры пралетарыяту.

Уся работа III сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту праходзіла пад знакам мабілізацыі сіл рабочае клясы і ўсіх працоўных, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, для рашучай клясавай барацьбы супроць кулацка-нэпманскіх контр - рэвалюцыйных элемэнтаў нашай краіны і імпэрыялістычна-інтэрвэнцкіх імкненьняў капіталістычнага сьвету.

Пасьпяховы рост сацыялістычнага будаўніцтва выклікае яраснае супраціўленьне аджываючых і ліквідуемых клясаў. Капіталістычныя інтэрвэнты заможных дзяржаў і ліквідуемае кулацтва ўнутры краіны імкнуцца затармазіць і сарваць ход пераможнага сацыялістычнага наступленьня.

Кулацтва і рэшткі капіталістычных элемэнтаў вылучаюць сваіх агентаў з дробна - буржуазнай нацыяналістычнай інтэлігенцыі, з верхавінак старых спецыялістаў, праз якіх арганізуюць шкодніцкую контр - рэвалюцыйную дзейнасьць, накіраваную на зрыў пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва і на зьвяржэньне пралетарскай дыктатуры.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР ад імя рабочых, калгасьнікаў, працоўнага сялянства і ўсіх працоўных заявіў, што «ўсе працоўныя БССР, якія працуюць на мяжы з капіталістычным сьветам, дадуць самы бязьлітасны адпор усялякім спробам замежных капіталістаў, калі толькі яны спрабуюць зрабіць напад на межы Савецкага Саюзу».

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт з абурэньнем аганьбіў контр - рэвалюцыйную шкодніцкую дзейнасьць беларускіх нацыянал - дэмакратаў і заявіў, што ўсякім імкненьням фашысцкай агентуры будзе даны самы бязьлітасны руйнуючы адпор.

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт адзначыў, што Савецкая Беларусь ідзе пераможна ўперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва, дзякуючы рашучаму правядзеньню ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай палітыкі, і ў далейшым увага ўсіх саветаў павінна быць накіравана на тое, каб усе пастановы партыі і ўраду па нацыянальнай палітыцы праводзіліся ў жыцьцё, каб, даючы руйнуючы адпор вялікадзяржаўнаму расійскаму шавінізму, як галоўнай небясьпецы на даным этапе, контррэвалюцыйнаму беларускаму нацыянал-дэмакратызму і іншым нацыяналістычным шавінізмам шляхам правядзеньня ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай палітыкі, усё больш згуртоўваць працоўных усіх нацыянальнасьцяй Савецкай Беларусі для вырашэньня задач сацыялістычнага будаўніцтва, для барацьбы за сацыялізм.

Вось асноўны зьмест тых пастаноў, якія былі вынесены Цэнтральным Выканаўчым Камітэтам.

Гэтыя пастановы павінны ўзброіць нашы саветы, як органы дыктатуры пралетарыяту павінны ўзброіць наш савецкі актыў і ўсіх працоўных БССР для далейшага вырашэньня задач сацыялістычнага будаўніцтва.

У адказ на шкодніцкую дзейнасьць контр - рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал - дэмакратаў рабочая клясы калгасьнікі, працоўнае сялянства і ўсіх працоўная інтэлігенцыя павінны згуртавацца навакол саветаў і іх кіраўніка —камуністычнай партыі, мабілізаваць усе свае сілы для далейшага разгорнутага наступленьня па ўсім фронце, для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, для пасьпаховага заканчэньня заданьняў асобнага ўдарнага квартялу і правядзеньня трэцяга рашаючага году пяцігодкі, для ўзмацненьня тэмпаў індустрыялізацыі, для далейшага разгортваньня суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі на гэтай базе кулацтва, як клясы, гэтай апошняй надзеі сусьветнага імпэрыялізму.

Мы яшчэ раз падкрэсьліваем, што ў нашай краіне ёсьць усе магчымасьці для таго, каб вырашыць гэтыя задачы каб пабудаваць сацыялізм. Вядучы рашучую барацьбу за генэральную лінію партыі, даючы руйнуючы адпор усялякага роду ўхілам ад генэральнай лініі партыі і праваму ўхілу, як найбольшай небясьпечнаму, у першую чаргу, мабілізуючы масы на барацьбу супроць кулакоў, нэпманаў і іншых контр - рэвалюцыйных, шкодніцкіх элемэнтаў у нашай краіне, заўсёды рыхтуючыся да таго, каб даць рашучы адпор інтэрвэнцкім імкненьням імпэрыялістычных дзяржаў,—мы будзем ісьці ўперад па шляху да канчатковай перамогі сацыялізму.

Мы ідзем пераможна ўперад, мы пераможам у барацьбе за сацыялізм.

Няхай жыве барацьба за перамогу сацыялізму!

Няхай жывуць саветы—органы дыктатуры пралетарыяту!

Няхай жыве камуністычная партыя—правадыр працоўных у барацьбе за сацыялізм!

(Гучныя воплескі. Інтэрнацыянал).

III-ю сэсію Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі абвяшчаю закрытай (Інтэрнацыянал).

Чарговыя задачы калектывізацыі сельскай гаспадаркі

З дакладу старшыні Белкалгасцэнтру тав. МІЦЬКОВА

Тав. Міцькоў пачынае свой даклад з характарыстыкі работы калгасаў. Некалькімі лічбамі дакладчык ілюструе перавагу работы калгасаў перад індывідуальным сэктарам. На кожную гаспадарку, якая ўвайшла ў калгас, прыпадае засеянай плошчы 5,7 гэкт., а на кожную адзіначасобную гаспадарку — толькі 3,6 гэкт., г. зн., што калгасы абрабілі і засеялі амаль у два разы больш, чым адзіначасобныя гаспадаркі. У весьнавую пасеўную кампанію ў калгасах на адну праказдольнага было аброблена і засеяна 1,5 гэкт., а ў адзіначасобных гаспадарках — 0,5 гэкт.

У асеньнюю пасеўную кампанію зазяблена ў калгасах на кожную гаспадарку 2,9 гэкт., у адзіначасобных гаспадарках — 1,3 гэкт.

Гэтыя лічбы сьведчаць, што ў калгасах лепш скарыстоўваецца рабочая сіла, галавая сіла, што прадукцыйнасьць працы ў калгасах у некалькі раз большая, чым у адзіначасобных гаспадарках.

Пераходзячы да пытаньня аб **тэмпах калектывізацыі**, т. Міцькоў прыводзіць кантрольныя лічбы калектывізацыі на 1931 г. Да вясны будучага году на аснове ленінскіх прынцыпаў і мэтадаў, павінна быць калектывізавана ня менш 30 проц. гаспадарак, да восені — ня менш 45 проц. Гэтыя заданьні бязумоўна рэальныя і пры адпаведных тэмпах работы могуць быць поўнасьцю выкананы.

За апошні час мы маем яўнае нарастаньне тэмпаў калектывізацыі. Так, за лістапад у калгасы ўступіла 2.600 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а за першыя дзесяць дзён сьнежня — 8.000.

Тым ня менш, тэмпы калектывізацыі на сёнешні дзень у большасьці раёнаў невыстарчальныя. Значная частка раёнаў БССР адстае. Тав. Міцькоў паказвае на тры асноўныя прычыны слабога разгортваньня калектывізацыі ў гэтых раёнах.

Першая прычына—неразуменьне часткай адказных работнікаў ленінскіх прынцыпаў калектывізацыі, скажэньне дзяржаўнага бюджэту на 1931 г. Пры складаньні гэтых плянаў урад БССР выходзіў з неабходнасьці мабілізаваць усе рэсурсы, каб захаваць і павялічыць дасягнутыя Савецкай Беларусьсю, чымі раённымі работнікамі, пасьля чаго значна ўзмацніўся прыліў у калгасы; за апошні час процант калектывізацыі па Круглянскім раёне павялічыўся з 17% да 22,5%.

Значнай перашкодай у разгортваньні калектывізацыі зьяўляецца недаацэнка значэньня правільнага разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў у калгасах. На сёнешні дзень яшчэ ня ўсе калгасы разьмеркавалі ўраджай.

Былі таксама скрыўленьні ў самым разьмеркаваньні ўраджаю і даходу. У радзе раёнаў разьмеркаваньне праводзілася не на падставе колькасьці і якасьці патрачанай кожным калгасьнікам працы, а на ліку едакоў.

Нарэшце, ёсьць рад фактаў, калі калгасы амаль што зачынялі дзьверы перад адзіначасобнікамі. Кудацкія элемэнты, якія пралазяць тым ці іншым спосабам у калгас, праводзяць там у гэтым напрамку сваю палітыку. У калгасе «Новы быт» (Астрашыцка-Гарадзецкі раён) на заяве 11 беднякоў і сераднякоў аб жаданьні ўступіць у калгас была вынесена пастанова: «залічыць членамі калгасу пасьля выкананьня ўсіх загатовак».

Ёсьць і такія факты, калі калгасы ня прымаюць батракоў і батрачак пад рознымі прычынамі: «ўстрымацца да агульнага сходу на калектывізацыі в. Шашлі», «адмовіць у прыёме, як нявытрымаўшым» і г. д.

У выніку ўсіх гэтых скажэньняў клясавай лініі, скрыўленьня дырэктыў партыі ў радзе раёнаў процант калектывізацыі зусім нізкі. У Гарадоцкім раёне калектывізацыя складае ўсяго 6,7%, у Дубровенскім — 6,4%, Стара-Дарожскім — 6,8%, Церахаўскім — 6,9% і г. д. Ёсьць і такія раёны, у якіх процант калектывізацыі ня толькі не павялічваецца, а, наадварот, памяншаецца. Так, па Камарынскім раёне процант калектывізаванай плошчы за час май-сьнежань зьнізіўся на 4,6%, па Стара-Дарожскім—на 2,9%, Лёзьнянскім—на 1,6%, Сьмілавіцкім — на 1,5%, Азарыцкім — на 1,4%. У той самы час ёсьць раёны, у якіх процант калектывізацыі досыць значны: у Лепельскім раёне — 33,8%, Клімавіцкім — 31,5%, Жыткавіцкім — 31,1% і інш.

Тав. **Міцькоў** вызначае задачы, што стаяць перад мясцовымі арганізацыямі на фронце разгортваньня калектывізацыі. Асноўная задача — **узмацніць барацьбу з кулаком, выхоўваць у масах калгасьнікаў клясавую нянавісьць да кулака. Трэба ачысьціць калгасы ад сацыяльна-чужых элемэнтаў.**

Трэба разгарнуць шырокую работу сярод беднякоў і сераднякоў адзіначасобнікаў, мабілізаваць усю увагу грамадзкасьці вакол калектывізацыі. Практыка ініцыятыўных груп павінна быць паширана. Мы маем ужо звыш 10 новых калгасаў, якія арганізаваны на ініцыятыве гэтых груп. Трэба таксама папышаць практыку арганізацыі вярбовачных камісій у калгасах.

Тав. **Міцькоў** паказвае на няўпасьць скажэньняў лініі партыі ў адносінах да форм калгасаў. Ёсьць работнікі, якія сьцьвярджаюць, што асноўнай формай калектывізацыі ў БССР зьяўляецца таварыства па апрацоўцы зямлі. Ёсьць і такія работнікі, якія зусім ігнаруюць гэтыя таварыствы. Зусім зразумела, што як першы, так і другі настрої — шкодныя. Партыя вызначыла асноўнай формай калектывізацыі сельска-гаспадарчую арцель. Але разам з гэтым партыя паставіла задачай пырока скарыстоўваць у раёнах нязбожжавай паласы і форму таварыства па апрацоўцы зямлі.

Далей т. Міцькоў паказвае на вялікае значэньне машына-трактарных станцый у разгортваньні калектывізацыі. У БССР на сёнешні дзень ёсьць 8 МТС, да вясны будзе арганізавана яшчэ 12 МТС. Аднак, у радзе месц наглядаецца яўная недаацэнка значэньня МТС. Даволі сказаць, што на працягу 2-х месяцаў нічога ня зроблена па мабілізацыі сродкаў на будаўніцтва машына-трактарных станцый у радзе раёнаў (Асьвейскім, Расонскім і іншых).

Мы маем, бязумоўна, вялізарныя посьпехі ў калгасным будаўніцтве. Аднак, было-б памылкай на бачыць і тых буйных недахопаў, якія мелі і маюць яшчэ месца.

Галоўным недахопам у рабоце калгасаў зьяўляецца кепская арганізацыя працы. У гэтым заключаецца асноўная прычына тых прарываў, якія мы мелі ў выкананьні раду гаспадарчых заданьняў.

Раённыя арганізацыі недаацэньваюць мэтаду зьдзельнічыны ў калгасах. Да гэтага часу толькі 10% калгасаў перайшлі на зьдзельныя нормы выпрацоўкі. Трэба больш шырока практыкаваць гэты мэтад працы, трэба перайсьці на цьвёрдыя нормы выпрацоўкі, поўнасьцю скарыстаць рабочую сілу ў калгасах, забясьпечыць здыходніцтва, забясьпечыць запатрабаваньні прамысловасьці і лесазагатовак у рабочай сіле.

Калгасная сыстэма павінна ўвесьці норму выпрацоўкі, перайсьці на брыгадны мэтад працы, абагрэкова наладзіць улік работы ў працадніёх, ліквідаваць цьвёрдыя стаўкі, якія няправільна называюцца заработнай платай. Трэба выкінуць з ужываньня такі тэрмін, як «зарплата ў калгасах».

Ва ўсіх калгасах павінны быць арганізаваны вытворчыя нарады.

Зусім зразумела, што ўсе гэтыя задачы ўскладаюцца ў першую чаргу на калгасную сыстэму. Але гэтыя задачы ня змогуць быць выкананы з посьпехам бяз удзелу ўсіх савецкіх органаў, усёй савецкай грамадзкасьці.

Сацыялістычная перабудова сельскай гаспадаркі павінна быць пастаўлена ў цэнтр увагі ўсёй нашай работы. Змагаючыся з правай практыкай, як галоўнай небясьпекай, «ліваўкімі» загібамі, двурушніцтвам і прымірэнцтвам да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі, бальшавіцкімі тэмпамі разгорнем калгасны рух, правядзем суцэльную калектывізацыю да канца пяцігодкі і ліквідуем на гэтай аснове кулацтва, як клясу.

Міцькоў заканчвае сваю прамову заклікам ня ўсыпляць увагі, ня ўспрымаць ня ўсе ўкрадзенае, ня ўсе ўкрадзенае, ня ўсе ўкрадзенае.

Дзяржаўны бюджэт і адзіны фінансавы плян БССР на 1931 год

Судаклад старшыні бюджэтнай камісіі ЦВК тав. КАЛІНІНА

Я буду гаварыць толькі аб тых зьменах, якія ўносяцца бюджэтнай камісіяй у самы бюджэт.

Перш за ўсё, аб **выкананьні бюджэту 1928-29 г.** Мы лічым, што трэба зацьвердзіць справаздачу аб выкананьні бюджэту 1928-29 г. і прыняць дырэктывы СНК БССР аб выкананьні бюджэту. У гэтых дырэктывах даюцца такія паказаньні, якія неабходны для далейшай работы.

Мы лічым неабходным павялічыць **прыбытковую частку бюджэту на 954.000 руб.**

Што датычыць **выдатковай часткі бюджэту**, дык бюджэтная камісія пасьля абмеркаваньня кожнага артыкулу ў пасобку ўносіць на зацьвярджэньне сэсіі ЦВК прапанову аб павялічэньні гэтай часткі бюджэту, ў наступных сумах: на правядзеньне курсаў ЦВК на падрыхтоўцы работнікаў, незавода савецкага апарату было вызначана, паводле праекту, 20.000 руб., мы павялічваем гэту суму да 50.000 руб.; па Наркамземе—на барацьбу са шкоднікамі палёў было асигнавана 22.000 рублёў, супроць 27.000 руб. у мінулым годзе. Мы лічым, што няма падстаў для зьмяншэньня гэтай сумы, што трэба пакінуць суму мінулага году, г. зн. 27.000 рублёў.

Пабудова цэнтральнай бібліятэкі ў Менску. Для таго, каб скончыць яе ў бягучым годзе, трэба павялічыць запраектаваную СНК суму на 90.000 рублёў. Гэтае павялічэньне мы і ўносім на зацьвярджэньне сэсіі ЦВК.

Суму, вызначаную для санаторна-курортнага лячэньня інвалідаў мы павялічваем на 5.000 руб.; фонд зарплаты работнікам міліцыі павялічваем на 5.115 руб.

Такім чынам, расходная частка бюджэту павялічваецца намі на 135.150 рублёў.

У той-жа час мы прапануем у расходнай частцы бюджэту скараціць на 10 проц. адміністрацыйна - гаспадарчыя выдаткі па цэнтральных установах. Гэта дасьць, прыкладна, каля 400.000 руб. эканоміі.

З якіх меркаваньняў выходзіць бюджэтная камісія? У бягучым годзе штаты цэнтральных установ і царкматаў павялічваюцца супроць мінулага году на 432 чал., зарплата апошніх складае 1.426.000 руб.

Бюджэтная камісія ўносіць прапанову аб скарачэньні на 10 проц. адміністрацыйна - гаспадарчых выдаткаў ва ўсіх ведамствах і цэнтральных установах (гэта не датычыць школ, больніц, навучальных устаноў, раёнаў, гарсаветаў, сельсаветаў).

Праўда, работа нашага цэнтральнага апарату, у сувязі з ліквідацыяй округ, значна ўскладнілася: пры акруговай структуры центральны апарат трымаў непасрэдную сувязь з 8 округамі, а зараз ён павінен трымаць сыстэматычную сувязь са 100 раёнамі, і з поўнай колькасьцю гарсаветаў; але тым ня менш, павялічэньне штатаў зьяўляецца немэтазгодным. **Трэба зьберагчы грошы з тым, каб выкарыстаць іх на гаспадарчыя мерапрыемствы.** Апрача таго, **гэта прымусіць нашы цэнтральныя ўстановы і наркаматы займацца рацыяналізатарскімі мерапрыемствамі** больш, чым яны займаліся гэтым да апошняга часу, гэта прымусіць установы паклапаціцца аб паляпшэньні работы свайго апарату, аб увядзеньні такой сыстэмы работы, якая забясьпечвала-б сыстэматычнае інструктаваньне і нармальную сувязь з раёнамі. Гэта прымусіць нашы ўстановы наладзіць работу так, каб кожны працаўнік адчуваў пэўную адказнасьць за якасьць і своячасовае выкананьне сваёй работы.

Такім чынам, прапановы, якія ўносіць бюджэтная камісія, некалькі мяняюць самы каштарыс.

Пытаньне аб напрамку, росьце і фінансаваньні нашай гаспадаркі было ўжо выстарчальна асьветлена ў дакладах т. т. Галадзеда і Мікуліча. Увесь цэнтр цяжару фінансаваньня гаспадаркі накіраваны на тое, каб фарсаваць разьвіцьцё народнае гаспадаркі і культуры, — рост па тэтых галінах фінансаваньня надзвычай вялікі.

Фінансаваньне народнае гаспадаркі па адзіным фінансавым плане павялічваецца на гэты год на 50,6 проц. і складае толькі па лініі гаспадарчых мерапрыемстваў 66,1 проц. фінансавага пляну.

Гэта гаворыць аб тым, што бюджэт і фінансавы плян цалкам адпавядаюць генэральнай лініі нашай партыі. Адзіны фінансавы плян павялічыўся па значна большую суму чым было вызначана ў пяцігадовым пляне. Калі паводле пяцігадовага пляну, адзіны фінплян на 1931 год павінен складаць 432 млн. руб., дык зараз ён складае 706 млн. Такім чынам, мы расьлі значна хутчэй, чым гэта прадугледжана нашым пяцігадовым плянам. Гэта выклікана вялікімі тэмпамі росту ўсёй нашай народнай гаспадаркі як прамысловасьці, так і сельскай гаспадаркі.

Таму, той факт, што аграмаджаны сэктар, адкуль мы чэрпаем сродкі, вырас на 54,7 проц. супроць мінулага году і дае 73,5 проц. агульнага пляну, гаворыць аб тым, што ўкладзеныя ў народную гаспадарку ў папярэднія гады сродкі зараз пачынаюць зварочвацца назад і ідуць на далейшае разьвіцьцё народнае гаспадаркі БССР.

Разьмер культурных выдаткаў паводле адзінага фінансавага пляну павялічваецца супроць мінулага году на 93 проц. Гэта гаворыць аб тым, што мы ня толькі на словах, але **на справе ажыцьцяўляем культурную рэвалюцыю.** Я ня буду спыняцца на гэтым пытаньні, — тав. Мікуліч учора ў сваім дакладзе гаварыў аб арганізацыі новых навучальных устаноў і г. д., але гэта лічба сьведчыць аб вялізарнай рабоце, якую мы праводзім на культурным фронце.

Я ўжо гаварыў, што мы міркуем пазіцыць адміністрацыйныя выдаткі на 10 проц. Выходзячы з адзінага фінансавага пляну, мы маем паніжэньне адміністрацыйных выдаткаў большае, чым у мінулым годзе. Калі ў мінулым годзе агульныя адміністрацыйныя выдаткі складалі 4,1 проц., дык у гэтым годзе яны складаюць 3,4 проц. Гэтыя лічбы сьведчаць, што агульныя выдаткі на дзяржаўны апарат паступова памяншаюцца.

Адзіны фінансавы плян і бюджэт трэба разглядаць, галоўным чынам, як адпрацыўны плян нашых установ, пачынаючы з цэнтральных і канчаючы низавымі. **Гэты плян, плян тэмпаў, які мы зараз запраектуем, павінен быць выкананы, яканасьць паказальнікі яго павінны быць поўнасьцю ажыцьцёўленыя.** У галіне будаўніцтва, у галіне прамысловасьці і сельскае гаспадаркі трэба дабіцца такога становішча, каб запраектаваны намі адзіны фінансавы плян быў своячасова выкананы.

У мінулым годзе мы мелі вельмі шмат недахопаў у галіне выкананьня пляну. Рад важнейшых мерапрыемстваў (па разьвіцьці жывёлагадоўлі, у прыватнасьці, на сьвінагадоўлі і інш.) у мінулым годзе выкананы вельмі слаба. Плян гаспадарчага будаўніцтва ў калгасах выкананы на 20-25 проц., у саўгасах—на 50 проц. Трэба дабіцца, каб на будучай сэсіі, пры разглядзе новага бюджэту і новага фінансавага пляну, такія лічбы не фігуравалі. Трэба дабіцца таго, каб кожная ўстанова, кожная арганізацыя своячасова выканала свой плян і ўсе яго якасныя паказальнікі. Гэта—з аднаго боку.

З другога боку—трэба дабіцца таго, каб наш фінансавы адзіны плян быў таксама выкананы. Я, маю на ўвазе галоўным чынам, тыя гаспадарчыя ўстановы і арганізацыі, якія павінны своячасова забясьпечыць паступленьне прыбыткаў, наводле адзінага фінансавага пляну.

У нас ёсьць рад арганізацый, якія надзвычай дрэнна выконваюць ускладзеныя на іх абавязкі. Таварышы, якія працуюць у раёнах, добра ведаюць, як ідзе на мясцох мабілізацыя ўнутраных сродкаў, ведаюць, як працуе рад каапэрацыйных арганізацый. Ёсьць такія арганізацыі, якія ня выканалі і 10 проц. пляну мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў. Такое зьявішча павінна быць зьнішчана. Фінансавыя планы павінны быць поўнасьцю выкананы, рэальныя магчымасьці для гэтага ёсьць. Патрэбна толькі сур'ёзная і сыстэматычная работа.

Неабходна—дабіцца **жорсткага рэжыму эканоміі.** Трэба вынаць з нашых устаноў і арганізацый усякія непатрэбныя непрадукцыйныя страты сродкаў. Трэба мабілізаваць грамадзкую думку вакол барацьбы за рэжым эканоміі прымусіць усе нашы ўстановы і арганізацыі захоўваць рэжым эканоміі. У нас у гэтых адносінах ёсьць яшчэ вельмі шмат недарачнасьцяй, таму пытаньне аб рэжыме эканоміі павінна быць пастаўлена з ўсёй жорсткасьцю. Трэба працягваць барацьбу за рэжым эканоміі, трэба дабіцца, каб нашы гаспадарчыя і адміністрацыйныя установы і арганізацыі сыстэматычна змагаліся з безгаспадарчасьцю, раскошаю і г. д.

У гэтай справе вялікую ролю павінны адыграць прафэсыянальныя арганізацыі. Яны павінны мабілізаваць работчую клясу на змаганьне за рэжым эканоміі. Гэта дасьць нам магчымасьць яшчэ больш узмацніць тэмпы разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР.

Таварышы, наш дзяржаўны апарат зьнізу да верху зьдулеецца такім апаратам, які праводзіць і ажыцьцяўляе дыктатуру пралетарыяту. У гэтым заключаецца розьніца паміж нашым дзяржаўным апаратам і апаратам капіталістычных краін. У капіталістычных краінах апарат пабудаваны, так, каб ён мог лепей падзяволіць рабочыя масы. Наш дзяржаўны апарат будуецца так, каб ажыцьцяўляць дыктатуру пралетарыяту. Дзяржаўны апарат адыграў значную ролю ў нашых дасягненьнях на фронце ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну. Без апарату,—як сказаў тав. Ленін,—мы існаваць ня можам і не маглі-б ажыцьцяўляць грандыёзных задач, якія ставім перад сабою.

У нашым дзяржаўным апараце ёсьць яшчэ шмат абураючых зьявішч бюракратызму і г. д. Ёсьць яшчэ такія работнікі ў нашым апараце, якія імкнуцца накіраваць работу яго супроць нас. Для таго, каб зрабіць наш апарат клясавым, трэба арганізаваць масавы работы кантроль над працай дзяржаўнага апарату.

Арганізацыя масавага рабочага кантролю над дзяржаўным апаратам зьяўляецца неабходнай умовай для выкананьня грандыёзных задач, якія ўскладаюцца на дзяржаўны апарат у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Трэба так наладзіць рабочы кантроль, каб дзяржаўны апарат працаваў больш дакладна, своячасова і поўнасьцю выконваў, задачы, якія на яго ўскладаюцца.

Трэба вычысьціць з дзяржаўнага апарату ўсіх бюракратаў, шкоднікаў, якія тым ці іншым чынам пралезьлі ў нашы ўстановы. Гэту задачу я асабліва падкрэсьліваю.

Плян, які запраектаваны СНК БССР, мы бязумоўна выканаем. Таму заручай—няўхільны рост актыўнасьці рабочай клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. Выкананьне гэтага пляну дасьць моцны штурмок для далейшага гаспадарчага і культурнага разьвіцьця нашай краіны, для далейшага пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва БССР. (Воплескі).

Перавыбары саветаў

Урачыстыя дэклярацыі і сапраўднасьць

На заводзе імя Ланцуцкага забылі аб увязцы справаздачна-перавыбарчай кампаніі з барацьбой за прамфінплян

У «Зьвязьдзе» ад 13-га сьнежня было зьмешчана паведамленьне аб тым, што гомельскі гарпрафсавет выклікаў на сацыялістычнае спаборніцтва на ленінным правядзеньні перавыбараў саветаў віцебскі і менскі гарпрафсаветы, што машынабудаўнічы завод імя Ланцуцкага прыняў выклік гомельскага заводу «Пралетары» і ў сваю чаргу зьвярнуўся з выклікам да менскага заводу «Энэргія».

Як выконваюцца дагавары на сацыялістычнае спаборніцтва? Як Гомель, які першым уключыўся ў перапалічку, ажыцьцяўляе ўзятыя на сябе абавязацельствы?

На справаздачным сходзе рабочых вагоннага цэху заводу імя Ланцуцкага прысутнічала толькі 30 проц. выбаршчыкаў (замест 558 толькі 172 выбаршчыкі), з іх да канца сходу засталася палова. На сход рабочых аборачнага цэху, прысьвечаны справаздачы гарсавету, прышло каля 35 проц. выбаршчыкаў. На сход ліцейнага цэху каля 50 проц. (замест 288—151 чал.). Толькі ў адным мэханічным цэху сабралася 85 проц. выбаршчыкаў.

Гэта пацьвердзіў і сам сакратар партарганізацыі заводу.

Рабочыя, якія выступалі ў спрэчках і зазначалі на невыкананьне наказу ў галіне добрабыту акраін і рабочага забесьпячэньня, не зьвязвалі гэтых пытаньняў з выкананьнем прамфінпляну. Ніхто не адзначыў і не напомніў, што завод імя Ланцуцкага выканаў праграму першых двух месяцаў ударнага кварталу толькі на 40 з лішнім процантаў.

Характэрна, што газэта «Палеская Праўда», якая аддала шмат увагі пытаньню аб ходзе справаздачнай кампаніі на заводзе імя Ланцуцкага, не заўважыла асноўнага прабелу ў рабоце заводзкіх арганізацый — **адсутнасьць увязкі справаздачна-перавыбарчай кампаніі з задачамі выкананьня прамфінпляну.**

Гомельская выбарчая камісія прызнала, што справаздачныя сходы на заводзе імя Ланцуцкага праведзены зусім нездавальняюча і пастанавіла правесьці ў трох цэхах паўторныя сходы.

Зараз **аб Віцебску.** Віцебскі гарпрафсавет прыняў выклік гомельскага і пасьпяшаўся выклікаць Менск. На жаль, уключаючыся ў сацспаборніцтва, Віцебскі гарпрафсавет, як відаць, лічыў гэта звычайнай фармальнасьцю. Калі-б гарпрафсавет сур'ёзна, як належыць падышоў да абавязкаў, узятых на сябе сацдагаворам, каб ён падрыхтаваўся да выкананьня гэтых дагавораў, дык ня было-б такіх фактаў, якія выявілі брыгады р

Раён--асноўнае зьвяно сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы

Даклад т. ХАЦКЕВІЧА аб ліквідацыі акруг і ўзмацненьні раённага і сельскага савецкага апарату

„...ПЛЕНУМ ЦК АДЗНАЧАЕ, ШТО Ў СУЧАСНЫ ПЭРЫЯД САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ РАЁН ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АСНОЎНЫМ ВУЗЛАВЫМ ПУНКТАМ УСЁЙ РАБОТЫ ПАРТЫІ Ў ВЁСЦЫ. „СЮДЫ СЬЦЯКАЮЦЦА НІЦІ КАЛГАСНАГА БУДАЎНІЦТВА І ЎСЯКАЙ ІНШАЙ ГАСПАДАРЧАЙ РАБОТЫ Ў ВЁСЦЫ І ПА ЛІНІІ КААПЭРАЦЫІ, І ПА ЛІНІІ САВЕТАЎ, І ПА ЛІНІІ ЗАГАТОВАК". (СТАЛІН)".

(З РЭЗАЛЮЦЫІ КАСТРЫЧНІЦКАГА ПЛЕНУМУ ЦК КП(б)БІ.

Таварышы! Як вядома, мы ліквідавалі акругі і з 1-га кастрычніка па ўсёй СССР, як і па ўсім Савецкім Саюзе, перайшлі на раённую сыстэму кіраўніцтва. На гэтай сэсіі ЦВК мы падвядзем яко некаторыя вынікі ліквідацыі акруг і пераходу на раённую сыстэму, як важнейшай рэформы ў дзяржаўным кіраўніцтве, а таксама абмяркуем вопытам работы райвыканкомаў пасьля пераходу на раённую сыстэму і вызначым асноўныя мерапрыемствы па ўзмацненьні раёнаў, узмацненьні низавога сельскага савецкага апарату.

Савецкі апарат у пэрыяд сацыялістычнай рэканструкцыі

На падставе правільнай генэральнай лініі ленінскай камуністычнай партыі мы з посьпехам ажыцьцяўляем шырокае сацыялістычнае наступленьне на элементы капіталізму ў горадзе і вёсцы. Ня гледзячы на праводзі і вылазкі правых апартуністаў, ня гледзячы на ліскоі на генэральную лінію партыі з боку «левых» загібчыкаў, ня гледзячы на выступленьні права-«лявацкага» блёку, — пад кіраўніцтвам кампартыі, мы з посьпехам ажыцьцяўляем задачы індустрыялізацыі краіны, з посьпехам выконваем пяцігодку за чатыры гады. Мы паставілі перад сабой задачу ў кароткі гістарычны пэрыяд дагнаць і пераганяць у сэнсе эканамічным, у сэнсе тэхнічным перадавыя капіталістычныя краіны. Мы гэту задачу выконаем, бо рукай таму зьяўляецца: правільнае кіраўніцтва нашай партыі ва ўсіх галінах будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне і ня чуваны творчы энтузіязм рабочых мас і працоўнага сялянства.

Толькі на гэтай аснове мы з посьпехам ажыцьцяўляем вялізныя тэмпы індустрыялізацыі краіны, мы з посьпехам ажыцьцяўляем задачы суцэльнай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і на гэтай падставе правозім ліквідацыю кулацтва як класа. Ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнага будаўніцтва патрабавала і патрабуе ад савецкай, ад выканаўчых камітэтаў, ад усіх грамадзкіх арганізацый вялікай напружанай працы. Ня так даўно мы сустрэліся з фактамі, што вялікіх калгаснага будаўніцтва, які мы мелі на вёсцы зьнізу, часта ня сустракаў адпрыманьня, бо низавы савецкі апарат часамі адставаў ад тэмпаў калгаснага руху саміх бядняцка-серадняцкіх мас сялянства; сельсаветы ў значнай части пляліся ў хвасьце гэтага руху, рабілі невыстарчальна кіравалі справай калектывізацыі, акругі сталі, галоўным чынам, перадатачным зьвяном, яны аджылі свой век і не маглі непасрэдна і своечасова ажыцьцяўляць кіраўніцтва вёсцамі, разгорнутым сацыялістычным будаўніцтвам, якое адбывалася ў раёнах. Цэнтр цяжару работы на сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і сацыялістычнага будаўніцтва знаходзіўся ў раёне.

Трэба было знайсьці выхад з гэтага становішча. Камуністычная партыя найшла гэты выхад ў пастаноўцы і вырашэньні пытаньня аб ліквідацыі акруг і пераходзе на раённую сыстэму кіраўніцтва.

Чаму ліквідаваны акругі

На XVI партэзьдзе тав. Сталін у палітычнай справаздачы, характарызуючы пастаноўку гэтага пытаньня, сказаў: «Ня можа быць сумненьня, што мы ня зможалі-б узьняць вялізарнай работы па перабудове сельскай гаспадаркі і разьвіцьці калгаснага руху, калі-б не правялі раёнаваньня. Узбуйненьне абласьцей і пераўтварэньне іх у раёны, ліквідацыя губэрань і пераўтварэньне іх у менш буйныя адзінкі (акругі), парэшце, стварэньне абласьцей, як простых апорных пунктаў ЦК — такі агульны выгляд раёнаваньня. Мэта раёнаваньня—наблізіць партыйна-савецкі і гаспадарча-кааперацыйны апарат да раёну і сяла для таго, каб атрымаць магчымасьць своечасова вырашыць набалеўшыя пытаньні сельскай гаспадаркі, яе ўздыму, яе рэканструкцыі...

— Але ці ўсё зроблена для таго, каб сапраўды наблізіць, як сьлед наблізіць, апарат да раёну і вёсак? Не, ня ўсё зроблена. Зараз цэнтр цяжару калгаснага будаўніцтва перанесены ў раёны...

— Ці добра забясьпечаны раёны патрэбнымі работнікамі?.. Ня можа быць сумненьня, што яны забясьпечаны працаўнікамі зусім невыстарчальна. Дзе-ж выхад? Што трэба зрабіць для таго, каб выправіць гэты недахоп і забясьпечыць раённыя арганізацыі па ўсіх галінах нашай работы выстарчальнай колькасьцю работнікаў? Для гэтага трэба зрабіць хаця-б дзьве рэчы: 1) зьнішчыць акругі, якія перашкаджаюць ў непатрэбнае «средостение» паміж вобласьцю і раёнамі, і за кошт акруговых работнікаў узмацніць раённыя арганізацыі; 2) зьвязаць раённыя арганізацыі непасрэдна з вобласьцю (крайкомам, нац. ЦК). Гэта і будзе давядзеньнем да канца справы наближэньня апарату да раёнаў і сёл».

Такім чынам, ліквідацыя акруг ставіла перад сабой дзьве асноўныя задачы: узмацніць раён, увесь низавы савецкі апарат, наблізіць органы савецкай улады да вёскі — зьвязаць раённыя арганізацыі непасрэдна з цэнтрам.

Апарат да і пасьля ліквідацыі акруг

Мы правялі ліквідацыю акруг па БССР у вызначаныя тэрміны. У выніку ліквідацыі акруг і пераходу на раённую сыстэму мы сапраўды наблізілі органы савецкай улады да раёну, да вёскі, папырыўшы правы і абавязкі раённых і сельскіх органаў улады; мы значна ўзмацнілі раёны адказнымі, кваліфікаванымі работнікамі, паслаўшы туды былых акруговых работнікаў у ліку 90%; а таксама накіраваўшы больш сотні адказных работнікаў цэнтральнага апарату для узмацненьня раённых арганізацый.

Мы значна палепшылі бюджэт — матар'яльную базу саветаў і райвыканкомаў, палепшылі матар'яльнае становішча низавых работнікаў, аб чым гаворыць наступныя лічбы і факты. Склад работнікаў акруговых і раённых выканаўчых камітэтаў да ліквідацыі акруг быў наступны: у 8 АВК было — 3.803 штатных адзінак, у 100 раённых выканаўчых камітэтаў — 2.600 штатных адзінак, а ўсяго 6.403 штатных адзінкі. Зараз штаты райвыканкомаў значна паялічаны, створаны аддзелы і інспэктараты райвыканкомаў, але ўсяго штатных адзінак ва ўсіх райвыканкомах 3.742 у той час, калі ў АВК і РВК разам было 6.403. Такім чынам, мы маем агульнае зьмяншэньне штатных адзінак на 41 проц.

Усе сельсаветы БССР мелі штат у 3.641 чал. Зараз, пасьля ліквідацыі акруг і некаторага павялічэньня ў больш буйных сельсаветах мы маем 3.959 штатных адзінак — павялічэньне толькі на 1 проц. Створан апарат гарсаветаў, як самастойны апарат кожнага гарсавету буйнейшых і дробных гарадоў. Установлен штат гарсаветаў у 512 адзінак.

Нас павінен цікавіць таксама і кошт апарату да ліквідацыі акруг і зараз. Апарат акруговых выканаўчых камітэтаў каштаваў 2.742.600 рублёў, райвыканкомаў — 2.122.500 рублёў, а ўсяго разам— 4.865.100 рублёў. Зараз апарат РВК каштуе 5.536.800 рублёў — гэта значыць ёсьць павялічэньне, у параўнаньні з коштам апарату АВК і РВК, на 13,81 проц.

Такім чынам, штат зьменшыўся на 41 проц., а кошт апарату РВК пасьля ліквідацыі акруг павялічыўся на 13,81 проц. Тут з усёй відавочнасьцю адбіваецца павышэньне заработнай платы раённых работнікаў.

Апарат сельсаветаў каштаваў раней 1.510.709 рублёў, цяпер — 2.673.000 рублёў, г. значыць плюс 76,94 проц. Агульны кошт апарату акрвыканкомаў, райвыканкомаў і сельсаветаў да ліквідацыі акруг і пераходу на раённую сыстэму складаў 6.375.809 рублёў, цяпер апарат РВК і сельсаветаў каштуе — 8.209.800 рублёў — плюс 28,76 проц.

Тут мы пекалькі ня выканалі тэй ды рэктывы, якая была дана нам пры пераходзе на раённую сыстэму, каб апарат РВК і саветаў ня быў больш дарагім, чым апарат АВК, РВК, сельсаветаў і гарсаветаў да ліквідацыі акруг і пераходу на раённую сыстэму.

Павялічваючы неабходны мінімум зарплаты, мы прымушаны былі павялічыць утрыманьне нашага апарату на 10 проц. Мы значна павялічылі заработак раённых і сельскіх работнікаў і правільна зрабілі, бо гэта адзін са сродкаў узмацненьня низавога апарату. Напрыклад, старшыня РВК атрымліваў 100-110 руб., сакратар і загадчыкі аддзеламі, — па 90 руб. Цяпер старшыня атрымлівае 175 руб., сакратар і загадчыкі аддзеламі РВК па 150 руб. Зарплата павялічана, як бачыце, больш чым у паўтара раза. Старшыня і сакратар сельсаветаў у сярэднім атрымлівалі 30-35 руб. — цяпер 50-60 рублёў. Як бачыце, зарплату работнікаў мы ўзьнялі амаль у два разы. Гэта значыць, матар'яльнае забясьпячэньне работнікаў сельсаветаў значна паляпшаецца.

Штаты цэнтральнага апарату пасьля ліквідацыі акруг павялічыліся на 411 адзінак, ці на 40 проц. Цэнтральны апарат да ліквідацыі акруг каштаваў 2.121.019 рублёў, а цяпер, пасьля ліквідацыі — 3.547.560 рублёў, павялічэньне на 1.426.541 руб. Такім чынам, утрыманьне цэнтральнага апарату за кошт дзяржаўнага бюджэту, пасьля ліквідацыі акруг значна павялічылася. І таму, зусім правільна пастанова Бюджэтнай Камісіі ЦВК, каб выдаткі на ўтрыманьне цэнтральнага апарату і адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі былі зьнижаны на 10 проц.

Рост раённага і сельскага бюджэту

Якое становішча бюджэту — матар'яльнай базы раёнаў і сельсаветаў пасьля ліквідацыі акруг і пераходу на раённую сыстэму? Мы будзем мець вялікі рост раённых бюджэтаў. Да ліквідацыі акруг з 1.472 сельсаветаў 333 мелі самастойныя сельскія бюджэты з агульнай сумай 5.137.000 руб. Цяпер бюджэты ўведзены ва ўсіх сельсаветах. Наводле меркаваньняў народнага камісарыяту фінансаў, сельскі бюджэт будзе ахапляць ад 32.800.000 руб. да 47.600.000 руб.

Гэта сума надзвычай вялікая, яна рашуча зьмяняе становішча сельскага савету, яна падводзіць вялічэзную матар'яльную базу пад яго дзейнасьць, яна дасьць магчымасьць нашым сельсаветам зусім па-новаму пабудаваць сваю арганізацыйную і гаспадарча-культурную работу.

Такім чынам, пасьля ліквідацыі акруг і пераходу на раённую сыстэму кіраўніцтва мы маем: **набліжэньне органаў улады да асноўных мас працоўных; узмацненьне раённага і сельскага апарату працаўнікамі; павялічэньне зарплаты работнікаў РВК і сельсаветаў, павялічэньне бюджэтаў, узмацненьне матар'яльнай базы раённага і низавога сельскага апарату.**

Мы надалі раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам буйных гарадоў — правы былых акруговых выканаўчых камітэтаў. Значна павялічаны правы, у кожным канкрэтным выпадку, раённых выканаўчых камітэтаў, раённых арганізацый, а таксама і сельсаветаў. Усё гэта робіць раён сапраўды асноўным зьвяном, якое забясьпечвае пасьпяховае выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва ў раёне, на вёсцы.

Недахопы работы па ўзмацненьні раёнаў

Разам з гэтым нам трэба спыніцца і на асноўных недахопах нашай работы па ліквідацыі акруг.

Першы недахоп — мы нераўнамерна разьмеркавалі працаўнікоў акруг па раёнах. Раёны, цэнтрам якіх зьяўляюцца гарады, раёны, якія знаходзяцца ля лініі чыгункі, забясьпечаны больш працаўнікамі і прытым лепшымі, больш моцнымі кіраўнікамі і тэхнічнымі спэцыялістамі, чым тыя раёны, якія знаходзяцца ў глыбінных пунктах, на вялікай адлегласьці ад гарадоў, ад чыгункі, па дзіўных шляхоў. Возьмем, напрыклад. Віцебшчыну — Віцебскі раён атрымаў 35 чалавек, Лёзьненскі раён — 22, Гарадоцкі — 21, Сураскі — 9 і самы далёкі — Межанскі — 6, прычым у бліжэйшы Высачанскі раён былі накіраваны намесьнік старшыні АВК, сакратар АВК, акруговы пракурор, акруговы інспэктар аховы здароўя, загадчык акруговага аддзелу сувязі і г. д. Усяго 14 адказных работнікаў у адзін бліжэйшы раён. Бабруйскі раён атрымаў 63 працаўнікі, з іх спэцыялістаў — 40 чал., Рагачоў атрымаў — 50 чал., Жлобін — 35 чал., Слуцак — 32, Парычы — 16, Клімавічы — 14, Сьвіслачы — 11, а іншыя больш адлеглыя раёны яшчэ менш. Буйны Касьцюковіцкі раён (Магілеўшчына), які аб'ядноўвае 26 сельсаветаў, з «дваццаткі» — гэта значыць, з адказных працаўнікоў акругі, не атрымаў ні аднаго чалавека. Таксама не атрымаў ні аднаго чалавека Чачэвіцкі раён. Затое, напрыклад, у Чавусы на фінансавую працу паехалі былы загадчык і намесьнік загадчыка фінаддзелу.

Трэба адзначыць, што народныя камісарыяты, цэнтральныя установы прынялі невыстарчальны ўдзел у разьмеркаваньні працаўнікоў. Некаторыя з іх цалкам спадзяюцца на работу акруговых ліквідацыйных камісій, а самі нічога ня робяць. І толькі пасьля, сустрэўшыся з фактам адсутнасьці ў радзе раёнаў адпаведных работнікаў, яны паступова сталі прызнаваць свае памылкі. Напрыклад, Дзяржплан з 25 працаўнікоў Менакрплану забраў у цэнтральны апарат 17 працаўнікоў, ніколькі не паклапаціўшыся аб укамплектаваньні раённага плянавага апарату; Наркамзем забраў у цэнтральны апарат 14 працаўнікоў Акрэа; НКФін забраў у цэнтральны апарат амаль ўвесь Менскі акрфа, ён не прасачыў за тым, што 110 фінансавых работнікаў, зараз трапілі ў іншыя ведамствы і працуюць там па розных галінах работы. Між тым была дырэктыва, каб пры разьмеркаваньні работнікаў, служачыя ліквідаваных акруговых устаноў былі накіраваны ў раёны па работу, на якой яны кваліфікаваліся. Цэнтральныя органы і наркаматы не дапамаглі акругам і раёнам найлепш разьмеркаваць работнікаў ліквідаванага акруговага зьвяна.

Другі недахоп — гэта рэзкае памяншэньне, у зьвязку з пераходам на раённую сыстэму, жанчын на кіруючай рабоце. У складзе прэзыдыуму АВК, аддзелаў, інспэктыратаў, на аснове адпаведных дырэктыў і пастаноў, працавала на адказнай кіруючай рабоце шмат жанчын - актывістак, работніц фабрык і заводаў, батрачак, сельгасработніц і бядняцкіх сялянак. З ліквідацыяй акруг амаль ні адна жанчына не папала з акруговага апарату на кіруючую работу ў раёны. Больш таго, пасьля ліквідацыі акруг былі зьняты і заменены мужчынамі жанчыны, якія займалі адказныя пасады ў райвыканкомах. Таму зараз вельмі мала актывістак работніц, батрачак і бяднячак засталося на кіруючай савецкай рабоце.

Мы лічым гэта зьявішча вялізарным недахопам. Разам з пераходам на раённую сыстэму ня былі дакладна распраца ваны паказаньні мясцом, каб ня толькі захаваць былую колькасьць актывістак-жанчын на адказнай кіруючай рабоце ў раёнах, але яшчэ больш павялічыць гэту колькасьць за кошт акруговых адказных работнікаў—жанчын.

Трэці недахоп — акруговыя ліквідацыйныя камісіі і раёны забыліся пра **вылучэньне.** На сёньня мы амаль ня маем ніводнага факту, каб у зьвязку з пераходам на раённую сыстэму была вылучана на адказную савецкую работу пэўная колькасьць актывістаў з калгасаў, саўгасаў, фабрык і заводаў.

Усе гэтыя «ліквідацыйныя» недахопы і ўпушчэньні трэба ў бліжэйшыя часы выправіць.

Работа цэнтральных устаноў у новых умовах

НК РСІ і арганддаел прэзыдыуму ЦВК па хаду ліквідацыі акруг і пераходу на раённую сыстэму праверылі 30 раёнаў з пункту погляду таго, як кіруюць наркаматы і цэнтральныя установы работай у раёне, як яны зьвязаліся з раёнамі, як самі раёны скарыстоўваюць свае новыя правы і выконваюць новыя абавязкі, як яны ўкамплектаваны і як у гэтым ім дапамагаюць цэнтральныя органы. Гэта праверка выявіла шмат цікавых фактаў, шмат матар'ялаў, галоўным чынам, адмоўнага характару.

Вось, напрыклад, было ўстаноўлена, што па **лініі ВСНГ** нават у кастрычніку ня было распрацавана пытаньне аб кіраўніцтве мясцовай прамысловасьцю. Між іншым, гэта наша балючае месца. Мы да гэтага часу яшчэ ня ведаем у якім становішчы зараз, у зьвязку з пераходам на раённую сыстэму, знаходзіцца мясцовая прамысловасьць, хто ёю кіруе, хто дапамагае, якія перспэктывы яе разьвіцьця ў БССР.

Наркамасьветы, арганізаваўшы ліквідацыйную камісію, больш нічога не зрабіў. У выніку раёны былі прадастаўлены самім сабе ў часе пераходу на раённую сыстэму.

Дзяржгандлю, замест дапамогі ўзмацненьню раёнаў, пачаў арганізоўваць па сутнасьці ранейшыя паветы, назваўшы іх вучасткамі, ён замест існаваўшых 8 акруг спрактаваў 18, так званых, вучасткаў. **Саюзхлеб** арганізаваў буйныя філіялы, якія павінны былі аб'яднаць некалькі раёнаў, напрыклад, Слуцкі, Капыльскі, Старобінскі і г. д. **Наркамюст** арганізаваў для Заслаўскага, Смалявіцкага, Самахвалавіцкага, Койданаўскага раёнаў пракурорска-дасьледчыя вучасткі з месцам знаходжаньня ў Менску (!). **Гапсоўшчадкаса** да канца кастрычніка яшчэ не арганізавала ні адной раённай касы, і ў выніку да гэтага часу больш чым у 50 раёнах раённыя ашчадныя касы не адкрыты.

Вось кароткі пералік тых недахопаў у рабоце цэнтральнага апарату, у зьвязку з пераходам на раённую сыстэму.

На жаль, трэба адзначыць, што цэнтральны апарат яшчэ і да гэтага часу ня зусім пераключыўся на кіраўніцтва раённымі установамі.

Становішча сувязі нездавальняючае

Тэхнічная, тэлефонная, тэлеграфная і радыё сувязь, у зьвязку з пераходам на раённую сыстэму, набывае надзвычай вялікае значэньне. Аднак, згодна даведкі ўпаўнаважанага Наркамшматлю, мы маем непасрэдную тэлефонную сувязь толькі з 32 раёнамі. Тэлефонная сувязь дрэнная чуласьці (паводле даведкі ўпаўнаважанага) наладжана з 41 раёнам. 57 раёнаў зусім ня маюць тэлеграфнай сувязі са сваім цэнтрам. Такім чынам, больш паловы раёнаў нашай рэспублікі ня мае тэлеграфнай сувязі. У гэтыя раёны тэлеграмы перадаюцца па тэлефону. Наогул, я павінен адзначыць, што якасьць тэлеграфнай сувязі і па тых раёнах, дзе і ёсьць тэлеграф надзвычай дрэнная. Нізавая тэлеграфная сетка безадказна блытае тэксты тэлеграм.

У кішэні кожнага старшыні райвыканкому знойдзецца шмат доўгіх, дорагакаштоўных, але незразумелых і, часамі непатрэбных тэлеграм.

Такім чынам, як бачыце, становішча сувязі зусім нездавальняючае.

Пытаньне сувязі зараз важнае і надзвычайна адказнае, якое трэба вырашаць усяму савецкаму апарату, усёй савецкай грамадзкасьці. Трэба дабіцца таго, каб **у кожным раёне быў тэлеграф і тэлефоны, трэба дабівацца,** каб у кожным раёне была сталая здавальняючая сувязь з цэнтрам — з Менскам па тэлеграфу, тэлефону, радыё — каб кожны сельсавет меў сувязь з райвыканкомам на працягу бліжэйшага году.

Пошта таксама працуе вельмі дрэнна. Пры пасылцы карэспандэнцый ў 100 раёнаў, і з гарадзкія саветы, якія непасрэдна падпарадкаваны цэнтру, $^1/_3$ пакетаў або гіне дзе-небудзь на пэрыферыі, альбо прыбывае са спазьненьнем на 2-3 тыдні. «Выразную» работу пошты нядаўна адчуваў. арганізацыйны аддзел прэзыдыуму ЦВК. Матар'ялы на выбарах саветаў трэба было тэрмінова накіраваць на месцы, некаторыя матар'ялы трапілі нават у Еўпаторыю (Крым), на Украіну, адрасы раёнаў пераблыталі, пазасылалі матар'ялы ў такія месцы, дзе іх і зараз ніяк ня знойдзеш. У выніку месцы не атрымалі своечасова важнейшых інструкцыйных матар'ялаў.

Некалькі слоў **аб радыё.** Радыёцэнтр нас запэўніў, што ў нас наладжана добрая сувязь з 58 раёнамі. Мы думалі гэтую сувязь скарыстаць для перадачы розных загадаў і распараджэньняў раёнам па радыё, але аказалася, што 17 раёнаў могуць нас слухаць, а іншыя раёны або зусім ня чуюць, або чуюць вельмі дрэнна. І, такім чынам, з радыё ў нас справа стаіць ня лепш, чым з іншымі сродкамі тэхнічнай сувязі.

Вось чаму нам трэба дабіцца, каб **радыё-ўстаноўкі былі ў кожным раёне,** каб праз іх можна было перадаваць загады і распараджэньні, а таксама даваць раёну адпаведныя інфармацыі аб тым, шот робіцца ў цэнтры, ведаць аб тым, як выконваюць месцы адпаведныя кампаніі, як ідзе сацспаборніцтва паміж раёнамі і саветамі.

Разам з гэтым, таварышы, трэба нармальна карыстацца сродкамі сувязі і перш за усё, **тэлеграфам.** У нас у апошнія часы насылаюць надзвычай многа тэлеграм. Гэта зусім прытупляе пачуцьцё адказнасьці у раённых кіруючых працаўнікоў, стварае нядбайныя адносіны да баявых важных заданьняў, якія толькі павінны перадавацца па тэлеграфу.

Гаворачы аб **пісьмовай сувязі з раёнамі,** я павінен зазначыць, што ніколі гісторыя савецкага будаўніцтва ня ведала такога пэрыяду, калі-б у низавы апарат пасылалася столькі папер, абежнікаў, тэлеграм, колькі сыплецца зараз. Між тым, калі мы вырашалі задачу ліквідацыі акруг і пераходу на раённую сыстэму, мы ставілі асноўнай задачай, пашырэньні правы райвыканкомаў, надаўшы im правы і абавязкі былых акрвыканкомаў, зьменшыць нават тую пісаніну, якая была раней. Аднак, пісаніна ня толькі ня зьменшылася, а значна павялічылася.

Цэнтральныя органы, амаль кожны дзень, часта па адным і тым-жа пытаньні пішуць па некалькі доўгіх абежнікаў, якія пачынаюцца з апісаньня гісторыі пытаньня і канчаюцца ўсякімі пагрозамі ў выпадку невыкананьня. І раёны часта таксама не ляпуюцца перадрукоўваць гэтыя доўгія абежнікі і накіроўваць іх у сельсаветы, якія ня маюць ні сіл, ні часу прачытаць гэтыя лісты.

Больш жывой сувязі, больш сапраўднага кіраўніцтва

Справу пісьмовай сувязі, кіраўніцтва раёнамі трэба рашуча выправіць, урэгуляваць.

Пераход на раённую сыстэму патрабаваў ад цэнтральнага апарату хутчэйшага пераключэньня ў рабоце і ўстанаўленьня жывой сувязі з раёнамі. Ня гледзячы на гэта, ня ўсе яшчэ цэнтральныя установы ўявілі сабе новае становішча раённых выканаўчых камітэтаў і неабходнасьць увязкі і ўзгадненьня з апошнімі мерапрыемствам, якія праводзяцца імі ў межах раёнаў. Цэнтральныя органы яшчэ не наладзілі з раёнамі патрэбнай жывой сувязі. Некаторыя цэнтральныя установы абмежаваліся наладжаньнем напраўной сувязі, пасылкай шматлікіх абежнікаў і тэлеграм, якія не садзейнічаюць узмацненьню работы раёнаў. Разам з гэтым назіраецца з боку цэнтральных устаноў спробы дробнага рэгламентаваньня і аджэнства над раёнамі. Жывая сувязь да гэтага часу, па-першае, слаба ўстаноўлена, а па-другое, яна не зьяўляецца сыстэматычнай, цялнавай, нармальнай, а часамі бывае нелётная, гастралёрская. Бліжэйшыя раёны часта запаўняюцца агентамі і розными ўпаўнаважанымі, затое ў раёнах адлеглых, дзе найбольш цяжка працаваць, дзе сувязь тэхнічная адсутнічае, шляхі зносіл дрэнныя, — там мы рэдка знойдзем работнікаў цэнтральнага апарату. Наогул кажучы, пакуль што ў большасьці выездаў у раёны посяць бяссыстэмны, гастралёрскі характар.

Выезды носяць часта характар збору вестак, загатоўкі паперы, — яны нічога карыснага цэнтру не даюць і нічым ў рабоце раёнам не дапамагаюць, а, наадварот, перашкаджаюць нармальнай рабоце низавога савецкага апарату.

Трэба пакласьці канец такім зьявішчам, трэба павесьці рашучую барацьбу з такімі «налётамі», трэба ўстанавіць плянавыя выезды для комплексных абсьледваньняў. Трэба забараніць, бяз ведама народнага камісарыяту рабоча-сялянскай інспэкцыі і арганддзелу праз ЦВК, рабіць выезды і абсьледваньні з тым, каб абсьледваньні і інструктаж насілі плянавы, угоднены, дзеловы характар, характар **дапамогі раёнам.**

Трэба ўвесьці ў практыку комплексны мэтад абсьледваньня, як асноўны мэтад, які сапраўды дапамагае гэтым раёнам, пераносячы вопыт добрай работы з адных раёнаў ў другія. Толькі такія абсьледваньні карысны і неабходны.

Улічыць асаблівасьці раёнаў

Разам з гэтым неабходна адзначыць, што **нашае кіраўніцтва да гэтага часу не дыферэнцыявана, праводзіцца бяз ўлічваньня гаспадарчых асаблівасьцяй таго ці іншага раёну.** Нашы загатоўчыя органы дагэтуль часта ня ведаюць, дзе загатаўляць лес, дзе лён, дзе каменьні, дзе бульбу, дзе грыбы, дзе капусту. Мы нагат не маем яшчэ звычайнага эканамічнага даведніка, які характарызуе раён. Нашы плянавыя, эканамічныя, загатоўчыя органы такога даведніка, ня гледзячы на своечасовыя даручэньні прэзыдыуму ЦВК, яшчэ не распрацавалі і часамі заблытваюцца самі і заблытваюць раёны.

Трэба даручыць Дзяржпляну з прыцягненьнем саміх раёнаў і адпаведных наркаматаў удасканаліць вывучэньне эканамічнага становішча раёнаў, напрамку разьвіцьця гаспадаркі і эканомікі, у мэтах спэцыялізацыі гаспадарчага і эканамічнага разьвіцьця кожнага раёну, правільна прыстасоўваць загатоўчыя пляны ня толькі да кожнага раёну, а нават да кожнага сельсавету.

Цэнтральны апарат і кіруючыя органы, для наладжаньня сувязі і кіраўніцтва і ўстанаўленьня кантролю над раёнамі, павінны перш за ўсё наладзіць плянаваньне работы ў раёнах і, па-другое, разгрузіць цэнтральны апарат ад апэрацыйных функцый. **За цэнтральнымі ўстановамі і народнымі камісарыятамі павінна быць захавана толькі плянаваньне, кантроль, агульнае кіраўніцтва і інструктаж.** На аснове гэтых прынцыпаў, трэба зьнішчыць папяровую і тэлеграфную цэпаніну і гастралёрства, упарадкаваць выезды з тым, каб яны насілі плянавы, сыстэматычны характар комплекснага, групавога абсьледваньня, вывучэньня і дапамогі рабоце раёнаў, устанавіць сапраўдны кантроль над выкананьнем дырэктыў.

Неабходна ў бліжэйшы час дыферэнцыяваць кіраўніцтва ў дапасаваньні да пэўных эканамічных груп раёнаў. Вельмі неабходнае і карыснае эканамічнае раёнаваньне, якое праводзіць СНК, яшчэ ня скончана. Ёсьць спрэчкі з боку раду раёнаў аб няправільным аднясеньні іх да таго ці іншага эканамічнага ўхілу, гэта азначае, што працу трэба ўдасканаліць, паглыбіць з тым, каб кожны раённы канком ведаў характарыстыку свайго раёну, свае гаспадарчыя задачы. Трэба даць мясцом кіруючую літаратуру.

Раён—асноўнае зьвяно сацбудаўніцтва

Зараз раён, як асноўнае зьвяно сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы, зразумела, патрабуе да сябе больш увагі з боку цэнтральнага апарату, бо пасьля ліквідацыі акруг роля раёнаў, роля сельсаветаў ў ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва надзвычай павялічылася.

Рашучае сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце нашай барацьбы і будаўніцтва выклікае жорсткае абвастрэньне клясавай барацьбы на мясцох, разгорнутае сацыялістычнае наступленьне на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі выклікаюць шалёнае супраціўленьне клясавага ворага, абвастрэньне клясавай барацьбы.

Кулацтва імкнецца да зрыву ўсіх мерапрыемстваў савецкай улады ў вёсцы. Гэта становішча патрабуе ад раённых органаў улады цьвёрдага правядзеньня палітыкі савецкай улады ў вёсцы, цьвёрдага кіраўніцтва ўсімі галінамі сацыялістычнага будаўніцтва, разгортваньня калгаснага будаўніцтва на аснове добраахвотнасьці і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Пры выраішэньні гэтых задач раёны павінны апірацца на рабочую праслойку ў вёсцы, на актыўнасьць калгаснікаў і батрацка-бядняцкіх мас вёскі, узмацняючы саюз з серадняком.

Вырашэньне задач суцэльнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі, галоўным чынам, ускладаецца зараз на асноўнае зьвяно — раён. Большасьць раёнаў сьмела і рашуча прыстасоўваецца да новай адказнай ролі, бярэ размах у рабоце, праяўляе самастойнасьць. Аднак, ёсьць раёны, якія працуюць вельмі слаба, неадважваюцца праяўляць самастойнасьць. Такія раёны часта на розных дробязях, на зусім простых зразумелых пытаньнях зварачаюцца за паказаньнямі ў цэнтральны апарат.

Разам з гэтым наглядаецца такое зьявішча, што ў некаторых раёнах усе сілы кінуты на вёску, а раён пакінуты без кіраўніцтва, у другіх — працаўнікі РВК рэдка заглядваюць у сельсаветы. Абедзьве крайнасьці адмоўна ўплываюць на работу, іх трэба, чым хутчэй ліквідаваць.

Раён павінен зараз адчуваць сябе як кіраўнік, як гаспадар, як той орган, які кіруе сацыялістычным будаўніцтвам на вёсцы, адказвае за яго ў раёне, як орган, які зьвязаны непасрэдна з цэнтрам. Ды сапраўдным пераключэньні цэнтральнага апарату тварам да раёнаў апошні ад гэтага толькі выйграе.

Узмацніць кіраўніцтва сельсаветамі

Сельсаветы на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва павінны адыгрываць яшчэ большую ролю, чым да гэтага часу. Мы прывыклі звужды лаяць сельсаветы, лаялі мы іх і на гэтай сэсіі ЦВК.

Але няправільна агулам лаяць усе сельсаветы. Зразумела, ёсьць рад добрых прыкладаў работы сельсаветаў, якія кіруюць калгасным рухам, стаяць на чале калектывізацыі, вядуць рашучую клясавую барацьбу. Аднак, ёсьць многа сельсаветаў, якія да гэтага часу яшчэ плятуцца ў хвасьце калектывізацыі, блытаюцца ў гэтай справе, не спраўляюцца з калгасным прыплывам.

Чым тлумачыцца такое становішча? Яно тлумачыцца перш за ўсё тым, што мы маем слабы падбор пралетарскіх кадраў і кваліфікаваных работнікаў у сельсаветах. Яшчэ і да гэтага часу слабая матар'яльная база сельсаветаў і ў гэтым ня толькі іх віна.

Як прычыну слабасьці сельсаветаў трэба таксама лічыць і невыстарчальнае кіраўніцтва з боку раёнаў і адпаведных цэнтральных органаў. Зараз гэта кіраўніцтва, у зьвязку з узмацненьнем саміх раёнаў, палепшылася, але яшчэ далёка невыстарчальна. **Трэба зьверху да нізу ўзмацніць кіраўніцтва сельсаветамі.**

Самае слабое месца ў рабоце значнай часткі сельсаветаў ў тым, што яны слабавата выконваюць асноўную задачу — **ўцягнуць шырокія працоўныя масы вёскі — сельгаспрабочых, батракоў, бедняку, калгаснікаў, серадняцкі актыў у практычную работу сельсаветаў,** праз адпаведныя камісіі і сэкцыі. Калі многія сельсаветы працуюць незадавальняюча, дык камісіі і сэкцыі пры саветах часта зусім не працуюць. Гэта значыць, што ў некаторых масцох працоўныя масы амаль ня ўцягнуты ў савецкае будаўніцтва.

Для ўзмацненьня саветаў трэба, ў першую чаргу, скарыстаць перавыбары саветаў. Трэба разварушыць працоўныя масы, батрацтва, беднату, калгаснікаў, знайсьці сярод іх актыў для ўзмацненьня, палепшэньня работы саветаў. У мінулым годзе было паслана на сталую работу ў сельсаветы каля 300 рабочых—членаў гарсаветаў. Частка ўдарнікаў, якія працавалі на вёсцы, асела ў сельсаветах у якасьці кіруючых работнікаў.

Аднак, задача павялічэньня рабочай, батрацкай праслойкі ў сельсаветах яшчэ далёка ня вырашана. Вось чаму ў гэтым годзе, у зьвязку з правядзеньнем справаздачна-перавыбарчай кампаніі, накіроўваюцца ў раёны 200 сельгаспрабочых, 50 батракоў і 300 камсамольцаў.

Пралетарскія кадры--у сельсаветы

Трэба ня ўхільна ўзмацняць пашы сельсаветы пралетарыямі, рабочымі, батракамі, бядняцкім элемэнтам, лепшымі калгаснікамі.

Разам з тым трэба зьвярнуць увагу на **перападрыхтоўку нізавых савецкіх работнікаў.** Да гэтага часу мы праводзілі ў цэнтры курсы па перападрыхтоўцы нізавых работнікаў. На працягу 3-х год мы склікалі курсы жанчын на 60 чал., падрыхтоўвалі іх да работы, арганізоўвалі курсы работнікаў нацмен. Напры

ГЕНЭРАЛЬНЫ АГЛЯД ПРАМЫСЛОВАСЬЦ

РАБОЧАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ—ВАЖНЕЙШАЕ ЗЬВЯНО

БАРАЦЬБЫ ЗА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ

У АТАКУ ЗА ЛЁН

КАЛГАСЫ—на перадавы вучастак ільназагатовак!

Полаччына ганебна адстае са здачай ільнавалакна.—У паасобных раёнах ільнамялкі бязьдзейнічаюць.—Канкурэнцыя паміж загатоўшчыкамі не ліквідавана.

Рашучы націск на кулака і бязьлітасная барацьба з правааапартуністычнай практыкай—асноўная ўмова посьпеху ільназагатовак

Сацыялістычны сэктар не пераключыўся на баявыя тэмпы

Тры тыдні таму назад Белкалгасцэнтр накіраваў у раёны 17 работнікаў, якім было даручана аказаць дапамогу калгасам у арганізацыі апрацоўкі ільну. Брыгадзіры наведалі 50 раёнаў.

Матар'ялы з месц паказваюць, што па многіх раёнах калгасы ў справе апрацоўкі і загатоўкі ільну ўсё яшчэ не пераключыліся на баявыя тэмпы.

Рэкорд злачынай нядбайнасьці і бездапаможнасьці паказваюць асобныя мясцовыя арганізацыі і праўленьні паасобных калгасаў, якія праявілі яркі прыклад правааапартуністычнай практыкі.

Па Гарадоцкім раёне ільном занята 10,19 проц. усёй яравой плошчы, у тым ліку калгасамі 330, 5 гэкт., саўгасамі —10 гэкт., адзіваасобнікамі — 3.045 гэкт.

Перажэнкан бальшасьць калгасаў Гарадоцкага раёну яшчэ не прыступіла да апрацоўкі ільну. У калгасах «Камсамолец», «Сталіна», «Ленінскі шлях», «Чырвоны авіятар» 20 гэкт. ільну засталіся пад сьнегам і папсаваны. У калгасе імя Чарвякова лён з 22 гэкт. знаходзіцца ў сьціртах і страціў 50 проц. сваёй вартасьці. Калгас «Камсамолец» паслаў з 4 гэкт. лён разам з галоўкамі. Лён папсаваўся.

7 ільнамялак, якія ёсьць у раёне, бязьдзейнічаюць. Пабудаваныя пры камуне «Чырвоны сьцяг» і пры Войхапаўскай базе два ільнасушыльна-мяльныя заводы яшчэ ня пущчаны. На новым ільнаапрацоўчым пункце пры камуне «Чырвоны сьцяг» печка аказалася нягодная. Прэміяльны фонд ня вызначаны.

Кіраўніцтва ільнапрацоўкай і загатоўкамі з боку райпаляводсаюзу і райкалгасаюзу адсутнічае.

У апошнія дні ў хоце ільназагатовак на Гарадоцкім раёне адзначаецца некаторы рост, але зусім слабы. Тэмп паступленьня ільнавалакна застаецца слабым.

Партыйныя арганізацыямі зараз арганізаваны ільнаводчы рэйд. Створана камсамольская брыгада з 12 чал., якая накіравана ў сельсаветы і калгасы. Абвешчана ўдарная дэкада па першапачатковай апрацоўцы і загатоўцы ільнавалакна і ільнасемя. Вызначаны цьвёрдыя тэрміны апрацоўкі і здачы ільнавалакна.

Талачынскі раён забясьпечан ільнамялкамі і дрывамі. Ільнамялкі, аднак, бязьдзейнічаюць толькі таму, што няма спэцыяліста, які дапамогбы сабраць часткі ільнамялак. **У калгасе імя XII зьезду КП(б)Б ільнамялкі не працуе толькі таму, што не падыходзяць прысланыя да яе часткі.**

У Круглянскім раёне апрацоўка ільнавалакна ў калгасах пачалася 3-я сьнежня. Да пачатку сьнежня калгасы ня мелі заданьняў і плянаў. Калгасьнікі ня былі інфармаваны аб пастанове СНК, пазоўдзе якое дровы для апрацоўкі ільну адпускаюцца ў першую чаргу.

Сярод загатоўчых арганізацый заўважаецца канкурэнцыя. Загатоўшчыкі ідзіцьваюць у адных і тых-жа раёнах, шматлікія пункты па прыёмцы ільну, але не вядуць масавай работы.

У Бярэзінскім раёне на 15 сьнежня замест 140 цэнтн. здана 9 з пал. цэнт. Калгасы Ляпянска-Дубровенскага агра-індустрыяльнага камбінату не паслалі каля 850 цэнтн. ільнасаломы.

М. К.

Калі прапрацуюць кантрольныя лічбы?

На бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце аб прапрацоўцы кантрольных лічбаў на 1931 год і складаньні сустрэчнага прамфінпляну ніхто пакуль што нід думае. Часу засталося мала. Заводзкія арганізацыі ня ўлічваюць, што добрая падрыхтоўка да выкананьня новых праграм лепшая гарантыя супроць прарываў. Гэта заводзіць слабае выкананьне праграмы ўдарнага кварталу, да якога амаль ніякай падрыхтоўкі ня было праведзена.

С. К.

„Тэмпы" віцебскай пошты

„Зьвязда" за 12 сьнежня не дастаўлена на прадпрыемствы

ВІЦЕБСК. (Наш кар.). Газэта «Зьвязда» за 12 сьнежня, у якой былі надрукаваны тэлеграмы ЦК КП(б)Б, ЦСПСБ і ВСНГ аб правядзеньні генэральнага агляду прамысловасьці і праграма агляду на віцебскай пошты не дастаўлена ў рабочы раён Маркаўшчына і на віцебскія прадпрыемствы.

На справе вядзецца расьсьледаньне. Вінаватыя будуць прыцягнуты да адказнасьці.

Сацыялістычны сэктар не пераключыўся на баявыя тэмпы

Тры тыдні таму назад Белкалгасцэнтр накіраваў у раёны 17 работнікаў, якім было даручана аказаць дапамогу калгасам у арганізацыі апрацоўкі ільну. Брыгадзіры наведалі 50 раёнаў.

Матар'ялы з месц паказваюць, што па многіх раёнах калгасы ў справе апрацоўкі і загатоўкі ільну ўсё яшчэ не пераключыліся на баявыя тэмпы.

Рэкорд злачынай нядбайнасьці і бездапаможнасьці паказваюць асобныя мясцовыя арганізацыі і праўленьні паасобных калгасаў, якія праявілі яркі прыклад правааапартуністычнай практыкі.

На Гарадоцкім раёне ільном занята 10,19 проц. усёй яравой плошчы, у тым ліку калгасамі 330, 5 гэкт., саўгасамі —10 гэкт., адзіваасобнікамі — 3.045 гэкт.

Перажэнкан бальшасьць калгасаў Гарадоцкага раёну яшчэ не прыступіла да апрацоўкі ільну. У калгасах «Камсамолец», «Сталіна», «Ленінскі шлях», «Чырвоны авіятар» 20 гэкт. ільну засталіся пад сьнегам і папсаваны. У калгасе імя Чарвякова лён з 22 гэкт. знаходзіцца ў сьціртах і страціў 50 проц. сваёй вартасьці. Калгас «Камсамолец» паслаў з 4 гэкт. лён разам з галоўкамі. Лён папсаваўся.

7 ільнамялак, якія ёсьць у раёне, бязьдзейнічаюць. Пабудаваныя пры камуне «Чырвоны сьцяг» і пры Войхапаўскай базе два ільнасушыльна-мяльныя заводы яшчэ ня пущчаны. На новым ільнаапрацоўчым пункце пры камуне «Чырвоны сьцяг» печка аказалася нягодная. Прэміяльны фонд ня вызначаны.

Кіраўніцтва ільнапрацоўкай і загатоўкамі з боку райпаляводсаюзу і райкалгасаюзу адсутнічае.

У апошнія дні ў хоце ільназагатовак на Гарадоцкім раёне адзначаецца некаторы рост, але зусім слабы. Тэмп паступленьня ільнавалакна застаецца слабым.

Партыйныя арганізацыямі зараз арганізаваны ільнаводчы рэйд. Створана камсамольская брыгада з 12 чал., якая накіравана ў сельсаветы і калгасы. Абвешчана ўдарная дэкада па першапачатковай апрацоўцы і загатоўцы ільнавалакна і ільнасемя. Вызначаны цьвёрдыя тэрміны апрацоўкі і здачы ільнавалакна.

Талачынскі раён забясьпечан ільнамялкамі і дрывамі. Ільнамялкі, аднак, бязьдзейнічаюць толькі таму, што няма спэцыяліста, які дапамогбы сабраць часткі ільнамялак. **У калгасе імя XII зьезду КП(б)Б ільнамялкі не працуе толькі таму, што не падыходзяць прысланыя да яе часткі.**

У Круглянскім раёне апрацоўка ільнавалакна ў калгасах пачалася 3-я сьнежня. Да пачатку сьнежня калгасы ня мелі заданьняў і плянаў. Калгасьнікі ня былі інфармаваны аб пастанове СНК, пазоўдзе якое дровы для апрацоўкі ільну адпускаюцца ў першую чаргу.

Сярод загатоўчых арганізацый заўважаецца канкурэнцыя. Загатоўшчыкі ідзіцьваюць у адных і тых-жа раёнах, шматлікія пункты па прыёмцы ільну, але не вядуць масавай работы.

У Бярэзінскім раёне на 15 сьнежня замест 140 цэнтн. здана 9 з пал. цэнт. Калгасы Ляпянска-Дубровенскага агра-індустрыяльнага камбінату не паслалі каля 850 цэнтн. ільнасаломы.

М. К.

Кулак хазае лён

ПАРЫЧЫ. Мясцовыя арганізацыі не аддаюць належнай увагі загатоўкам ільнавалакна і семя. Па ільнавалакне заданьне выкананa на 6,5 проц., па ільнасемі — на 6,3 проц.

Кулацка-заможныя гаспадаркі ня выконваюць цьвёрдых заданьняў у вызначаныя тэрміны. У радзе сельсаветаў цьвёрдыя заданьні наогул ня былі даны кулацкім гаспадаркам.

Кааперацыя ня выконвае дырэктывы ўрэду аб прэміяваньні здатчыкаў ільнавалакна. Так, крама спажывецкай кааперацыі выдае прэміі толькі тым, хто здае ільнавалакно спажывецкай кааперацыі. Ільназдатчыкі-ж папяводчай сыстэмы прэміі не атрымліваюць, што выклікае папрокі з боку сялян.

Райгандаль бязьдзейнічае. Грамадзкасьць, калгасьнікі і бядняцка-серадняцкія масы сялянства слаба мабілізаваны на выкананьне плану ільназагатовак.

Я. Мар.

Кантрактацыйныя ўмовы выконаць поўнасьцю і ў тэрмін

У Койданаўскім раёне выяўлены выпадкі здачы калгасамі ільнавалакна спажывецкай кааперацыі з атрыманьнем поўнай сумы яго кошту. Авансы-ж, выданыя гэтым калгасам па кантрактацыі ільнавалакна, засталіся ня вылічанымі. У гэтым-жа раёне калгас «Новае жыцьцё» 50 проц. семя пусьціў на адкорм цялят.

Белкалгасцэнтр прапанаваў усім райкалгасаюзам прасачыць за поўным і абавязковым выкананьнем калгасамі кантрактацыйных умоў, асабліва ў адносінах здачы ільнавалакна, семя і канапелі. Калгасы, якія ня выконваюць кантрактацыйных дагавораў, павінны быць пазбаўлены крэдытаў.

Забаранецца скарміваць і мяць ільнасемя, віку і іншыя дэфіцытныя культуры.

Белкалгасцэнтр напамінае, што арганізацыя ў калгасах першапачатковай апрацоўкі ільну і здача яго дзяржаве—адказная і баявая задача. Яна павінна быць абавязково выканана ў бліжэйшы тэрмін.

Не загатоўлена нічога

Ільназагатоўкі ў Махіраўскім сельсавеце, Полацкага раёну, зрываюцца. Да гэтуль не загатоўлена ні аднаго кілёграма ільнавалакна. Пляны ільназагатовак не даведзены да вёсак. Кулацка-заможным гаспадаркам ня дана цьвёрдых заданьняў.

Сельсавет, парт'ячэйка бязьдзейнічаюць.

С.

Полацк толькі 2 проц.

ПОЛАЦАК. Плян загатовак ільнавалакна па Полацкім раёне на 15 сьнежня выкананa на 2 проц., а па ільнасемі—на 38 проц.

Калгасы здалі адну тону ільнавалакна замест 64, а індывідуальны сэктар — 2 тоны замест 136 тон, вызначаных планам.

Цьвёрдыя заданьні даны 113 кулацкім гаспадаркам. Але кулакі замест 10 тон здалі толькі... 60 клгр.

10 сельсаветаў наогул це падалі сьпісаў кулацкіх гаспадарак, якім павінны быць даны цьвёрдыя заданьні.

Арлейскі, Эйманскі, Васільлеўскі, Дамнікоўскі, Юравіцкі, Махіроўскі, Бэярскі, Сястронскі, Малаа-Сітнянскі і Сосьніцкі сельсаветы лічаць ільназагатоўкі другараднай справай і трымаюць сьпісы кулацкіх двароў пад сукном.

Такія адносіны да ільназагатовак з боку раду мясцовых работнікаў трэба кваліфікаваць, як самае грубае праяўленьне правага апартунізму на практыцы.

Топчуцца на месцы

БОРКАВІЧЫ. (Наш. кар.). Па сельсаветах Боркавіцкага раёну да гэтага часу загатоўка ільну не разгарнулася, як належыць.

Асабліва адстаюць у здачы ільну калгасы. На мясцох наглядаецца нескарыстаньне ільнамялак у той час, калі ёсьць шмат неапрацаванай трэсты. Боркавіцкая ільнабаза не падрыхтавана да прыёму ільну.

На 5 сьнежня плян загатовак па ільнавалакне выкананы на 1,8 проц., па ільнасемі — на 28 проц.

РК КП(б)Б і РВК прынялі меры да узмацненьня загатовак. Пасланы ў сельсаветы спэцыяльныя брыгады з адказных работнікаў.

М — ч.

259 калгасаў—3.762 новых калгасьнікаў „дала „дэкада калектывізацыі і ўраджаю"

ПАВОДЛЕ ВЕСТАК З 81 РАЁНАЎ БССР, НА ПРАНЯГУ ДЭКАДЫ «КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ І ЎРАДЖАЮ» АРГАНІЗАВАНА 675 ІНІЦЫЯТЫЎНЫХ ГРУП З АДЗІНААСОБНІКАЎ, СТВОРАНА 716 ВЯРБОВАЧНЫХ КАЛГАСНЫХ КАМІСІЙ, ЯКІЯ УЦЯГНУЛІ Ў КАЛГАСЫ 2.488 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ДВАРОЎ. УСЯГО ЗА ГЭТЫ ЧАС АРГАНІЗАВАНА 259 НОВЫХ КАЛГАСАЎ, У ЯКІЯ ЎСТУПІЛА 3.762 ДВАРЫ.

Арганізуем рабочыя брыгады для праверкі гандальпрамфінпляну каапэрацыі, прад'явім сустрэчныя пляны разьвіцьця каапэрацыйнай гаспадаркі, дапаможам ЦРК наладзіць рабочае забесьпячэньне і грамадзкае харчаваньне

ПАЧЫНАНЬНЕ МЕНСКАЙ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ—НА ЎСЕ ПРАДПРЫЕМСТВЫ БССР

Адкрыты ліст да рабочых фабрыкі „Кастрычнік" і заводаў „Энэргія", „Камунар" і „Бальшавік"

Дарагія таварышы!

Трэці год пяцігодкі ставіць перад намі вельмі адказныя задачы. Трэба ўжо з самага пачатку новага году зарысьпечыць нашы фабрыкі і заводы ад прарываў і дабіцца выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. Лёзунг партыі і рабочай клясы — «ПЯЦІГОДКА — ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ» — павінен быць абавязкова выканан.

Побач з вялізарнымі посьпехамі сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне, побач з вялізарным ростам усіх галін сацыялістычнай гаспадаркі, мы адчуваем некаторыя труднасьці, ЗЬВЯЗАНЫЯ З НАШЫМ РОСТАМ. Але гэтыя труднасьці такога парадку, што пры напружаньні сіл і энэргіі рабочае клясы, пры ўзмацненьні рабочага кантролю над працай савецкага і каапэрацыйнага апарату, можна дабіцца значнага палягчэньня гэтых труднасьцяй.

У прыватнасьці, мы да гэтага часу адчуваем рад недахопаў у рабоце нашай каапэрацыі ў справе рабочага забесьпячэньня. Таксама шмат недахопаў у рабоце заводзкіх сталовых, прычым віна за гэтыя недахопы кладзецца на толькі на каапэрацыю, але і на заводзкіх кіраўнікоў, на адміністрацыю, якая яшчэ не заўсёды глядзіць на сталоўку, як на цэх заводу. БЕЗ РАБОЧАГА КАНТРОЛЮ Ў ГЭТАЙ СПРАВЕ, БЕЗ АКТЫЎНАЙ ПРАКТЫЧНАЙ ДАПАМОГІ ШЫРОКІХ РАБОЧЫХ МАС У СПРАВЕ ПАЛЯПШЭНЬНЯ РАБОЧАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ, КААПЭРАЦЫЯ НЯ СПРАВІЦЦА СА СВАІМІ ЗАДАЧАМІ.

Таму мы, рабочыя менскай абутковай фабрыкі, парашылі ДАПАМАГЧЫ МЦРК У ЯГО РАБОЦЕ. МЫ ВЫЛУЧЫЛІ ТРЫ РАБОЧЫЯ БРЫГАДЫ ПА 7-8 ЧАЛАВЕК У КОЖНАЙ ДЛЯ ПРАВЕРКІ РЭАЛЬНАСЬЦІ КААПЭРАЦЫЙНАГА ПЛЯНУ РАБОТЫ І ВЫЯЎЛЕНЬНЯ ДАДАТКОВЫХ УНУТРАНЫХ РЭСУРСАЎ ДЛЯ МАГЧЫМАГА ПАВЯЛІЧЭНЬНЯ ГЭТАГА ПЛЯНУ. Каб не распыляцца, мы ўзялі для праверкі толькі адну галіну работы каапэрацыі —ПРЫГАРАДНЫЯ ГАСПАДАРКІ. Нашы брыгады пачалі праверку тых даных, на падставе якіх складзен плян разьвіцьця прыгарадных гаспадарак на 1931 г.

Потым мы абсьледуем становішча прыгарадных гаспадарак, арганізуем сходы рабочых і служачых гэтых гаспадарак з мэтай выяўленьня ўнутраных рэсурсаў, каб мець магчымасьць прад'явіць МЦРК НАШ СУСТРЭЧНЫ ПЛЯН РАЗЬВІЦЬЦЯ ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК.

Але ў МЦРК ёсьць яшчэ шмат галін работы. Абсьледаваць усе галіны работы МЦРК нашай фабрыкі цяжка. Таму мы звярнемся да вас з просьбай ТАКСАМА ЎЗЯЦЬ ПА АДНАЙ ГАЛІНЕ РАБОТЫ МЦРК ДЛЯ ПРАВЕРКІ І СКЛАДАНЬНЯ СУСТРЭЧНАГА ПЛЯНУ.

Мы лічым, што ШВОЧНАЯ ФАБРЫКА «КАСТРЫЧНІК» ПАВІННА ДАПАМАГЧЫ НАМ АБСЬЛЕДАВАЦЬ ПРЫГАРАДНУЮ ГАСПАДАРКУ, ЗАВОД «ЭНЭРГІЯ» ПАВІНЕН АБСЬЛЕДАВАЦЬ ГРАМАДЗКАЕ ХАРЧАВАНЬНЕ, «КАМУНАР» — СЭКТАР ЗАГАТОВАК І «БАЛЬШАВІК» — СЭКТАР РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ.

І трэба так павесьці работу, каб скончыць яе на працягу ня больш ДВУХ ТЫДНЯЎ. Чым хутчэй мы скончым работу, тым больш часу застанецца МЦРК для ажыцьцяўленьня нашых сустрэчных плянаў.

Але прад'яўленьне МЦРК сустрэчнага пляну зьявіцца толькі ЧАСТКАЙ НАШАЙ РАБОТЫ. Асноўная наша задача — ДАПАМАГЧЫ МЦРК РАДАМ ПРАКТЫЧНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ І НЕПАСРЭДНЫМ УДЗЕЛАМ АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ ГЭТЫЯ ПЛЯНЫ. Таму мы думаем заключыць з МЦРК СПЭЦЫЯЛЬНЫ ДАГАВОР З УЗАЕМНЫМІ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАМІ. МЦРК павінен будзе ўзяць на сябе рад абавязкаў па ажыцьцяўленьні сустрэчных плянаў разьвіцьця каапэрацыйнай гаспадаркі і палялпшэньні абслугоўваньня фабрык і заводаў. А мы павінны ўзяць на сябе абавязкі — ДАПАМАГЧЫ МЦРК, калі гэта будзе патрэбна, РАБОЧАЙ СІЛАЙ, АРГАНІЗАЦЫЯЙ СУБОТНІКАЎ, БУКСІРНЫХ БРЫГАД, ГАРОДНЫХ АРНЕЛЯЎ, УЦЯГНЕНЬНЕМ НОВЫХ ПАЙШЧЫКАЎ, ЗБОРАМ ПАЁЎ, ПРАДУКТОВЫХ АДКІДАЎ НА КВАТЭРАХ, АРГАНІЗАЦЫЯЙ СЬВІНАРНІКАЎ, ПАЦЫРЭЎНЕМ ТРУСАГАЛОЎЛІ, ПРАКТЫЧНАЙ ДАПАМОГАЙ У АБСТАЛЯВАНЬНІ СТАЛОВЫХ І Г. Д.

Частку абавязкаў па гэтых дагаворах павінна будзе ўзяць на сябе і наша АДМІНІСТРАЦЫЯ І ПРАФАРГАНІЗАЦЫЯ (згодна апошняга дыяктыўнага ліста УсеЦСПС і ВСНГ БССР). Гэты дагавор мы думаем заключыць таксама на масавых рабочых сходах. ПАСЬЛЯ МАСАВАГА АБМЕРКАВАНЬНЯ ЯГО Ў ЦЭХАХ І БРЫГАДАХ. Масавы кантроль над заключэньнем гэтых дагаворў, а таксама ДАЛЕЙШАЯ СЫСТЭМАТЫЧНАЯ ПРАВЕРКА ІХ ВЫКАНАНЬНЯ павінны прымусіць заводзкія арганізацыі, у тым ліку і адміністрацыю, больш увагі аддаваць палялпшэньню рабочага забесьпячэньня і грамадзкага харчаваньня.

Вось коратка асноўныя моманты нашай дапамогі рабочай каапэрацыі, якія мы павінны пачаць ажыцьцяўляць неадкладна для забесьпячэньня выкананьня сустрэчных прамфінпляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Звярнаючыся да вас з гэтым лістом, мы спадзяемся, што вы хутка адгукнецеся на наш заклік, выпучыце рабочыя брыгады і пачнеце работу.

РАБОЧЫЯ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ.

Прэзыдыум ЦСПСБ аб пачынаньні абутковай фабрыкі

ІНІЦЫЯТЫВУ РАБОЧЫХ АБУТКОВАЙ ФАБРЫКІ ПА СКЛАДАНЬНІ СУСТРЭЧНАГА КААПЭРАЦЫЯНАГА ПЛЯНУ ПА ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРКАХ МЦРК ПАДТРЫМАЦЬ, ДАРУЧЫЎШЫ САЦЫЯЛЬНА - ВЫТАВОМУ СЭКТАРУ, ЦП САЮЗУ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ РАЗАМ З БЕЛКААПСАЮЗАМ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ГЭТУ РАБОТУ АДПАВЕДНЫМІ СПЭЦЫЯЛІСТАМІ, ШЫРОКА ПАПУЛЯРЫЗУЮЧЫ СЯРОД РАБОЧЫХ ІНШЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ ГЭТАЕ ПАЧЫНАНЬНЕ.

ЦП САЮЗАЎ САЎГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ І НАРХАРЧ—РАСПРАЦАВАЦЬ КАНКРЭТНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА САПРАЎДНЫМ РАЗГОРТВАНЬНІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА СЯРОД ЧЛЕНАЎ САЮЗАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ У СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ, ШЫРОКА АРГАНІЗУЮЧЫ «СКВОЗНЫЯ» БРЫГАДЫ І ГРАМАДЗКІ БУКСІР З БОКУ ТЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ЯКІЯ ПРАВОДЗЯЦЬ РАБОЧЫ КАНТРОЛЬ НАД АСОБНЫМІ ЗЬВЕНЬНЯМІ КААПЭРАЦЫІ.

Тэхнік—ударнік тав. Шаякін

Ударная брыгада на дапамогу разьмеркавальніку

Паставіць на належную вышыню забесьпячэньне рабочых Бабруйскага камбінату

Закрыты разьмеркавальнік пры Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце абслугоўвае каля 4.000 рабочых. Здавалася-б, што ён павінен быць пры стасаваны для абслугоўваньня такой колькасьці людзей. Аднак, разьмеркавальнік разьлічан ня больш чым на 1.000 чал.

Больш паўгоду, як паміж праўленьнем Бабруйскага ЦРК і кіраўніцтвам камбінату вядуцца спрэчкі аб тым, хто павінен пабудаваць памяшканьне для разьмеркавальніка, але справа стаіць на месцы.

Такое становішча выклікае штодзенна ў разьмеркавальніку вялікія чаргі рабочых і работніц. Па гэтай прычыне каля 30 проц. рабочых яшчэ не прымапаваліся да разьмеркавальніка.

Забесьпячэньне разьмеркавальніка **кульгае на абедзьве нагі.** Здавалася-б што ва ўмовах Бабруйску, калі камбінат зьяўляецца буйнейшым прадпрыемствам, трэба было рабочых камбінату забясьпечваць у першую чаргу. Між тым, забесьпячэньне разьмеркавальніка вельмі кепскае. Гэта канстатаваў і заўком камбінату па дакладу загадчыка разьмеркавальніка.

Ёсьць выпадкі, калі тыя ці іншыя тавары, якія бракуюцца гарадзкімі крамамі, накіроўваюцца ў разьмеркавальнік камбінату. І, наадварот, у разьмеркавальніку часта няма тых тавараў, якія ў гарадзкіх крамах рэалізуюцца па каапэрацыйных кніжках. Хлеб у разьмеркавальніку дастаўляецца з вялікім спазьненьнем, што выклікае чаргі. Пад ведамам разьмеркавальніка знаходзіцца каля 10 ларкоў у паасобных цэхах камбінату. І тут мы маем вялікія няўвязкі: у цэх, які налічвае 800 рабочых, дасылаюцца прадукты на 400 рабочых і наадрот. Усё гэта выклікае нездавальненьне рабочых, і пават работнікі лараабураюцца такім галаваньнем.

Зараз заўком вылучыў брыгаду **трох рабочых-ударнікаў,** якія павінны дапамагчы разьмеркавальніку д паставіць сваю работу.

С. КАГАН

Па гадзіне трацяць рабочыя на абед

Чаму не скарыстоўваецца практыка маскоўскіх заводаў „Электропровода" і „АМО"?

На радзе буйнейшых прадпрыемстваў Барысава ёсьць сталоўкі, якія барысаўскі ЦРК называе «закрытымі». На справе-ж сталоўкі працуюць зусім дрэнна і пават горш, чым адкрытыя. Замест таго, каб сталоўкі зьявіліся дапаможнікамі ў выкананьні прамфінпляну, яны ў сваёй большасьці **тармозяць** выкананьне прамфінпляну. Сталоўка пры фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»,** якая абслугоўвае каля 3.000 рабочых, не адпавядае свайму прызначэньню. Для таго, каб рабочаму паабедаць, ён павінен пастаяць **паўгадзіны ў чарзе,** пакуль атрымае талён на абед, і паўгадзіны, пакуль атрымае абед. Часта рабочы не пасьпявае за час абедзенага перапынку паесьці і застаецца без абеду. Кожны дзень дзесяткі рабочых застаюцца на 10-15 мінут пасьля гудка, каб закончыць абед. Сталоўка не забясьпечана пачынньнем. Пават дзераўяных лыжак не хапае, а відэльцаў зусім няма. Дрэнна абслугоўваецца другая і трэцяя зьмена.

Сталоўка пры заводзе **імя Домбаля** да гэтага часу лічылася адной з лепшых сталовак, за што атрымала прэмію. **Але пасьля атрыманьня прэміі сталоўка пачала працаваць горш, чым іншыя сталоўкі.** Бруд, цеснота, чаргі. Па 1-2 гадзіны трацяць рабочы, каб паабедаць. Былі выпадкі, калі ў сталоўцы не хапала абедаў. Адміністрацыя сталоўкі лічыць яе камэрцыйнай адзінкай, якая павінна даваць прыбытак, і на тавары, што адпускаюцца з буфету, робіць накідкі каля 300-400 проц. Вось прыклад. Адміністрацыя сталоўкі купляе курыцу коштам у 1 р. 20 к. (паводле калькуляцыі праўленьня ЦРК), варыць яе, падзяляе на **8 частак** і прадае кожную частку **па 1 рублі** (?!).

Грамадзкі кантроль над работай сталовак адсутнічае. Фабзаўкомы і адміністрацыя прадпрыемстваў ня лічаць сваім абавязкам займацца палялпшэньнем работы сталоўкі. Трэба зараз-жа перабудаваць усю работу сталовак, зрабіўшы іх сапраўдным закрытымі сталоўкамі, а да тых, якія перашкаджаюць і не жадаюць займацца палялпшэньнем работы сталовак, трэба ўжыць самыя рашучыя меры.

Н. НЭЙДЛІН.

НАСУСТРАЧ ВЕСНАВОЙ СЯЎБЕ

НЯ МЕНШ 37%

ЯРАВОГА КЛІНУ ПАВІНЕН ЗАСЕЯЦЬ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ СЭКТАР

ГЭТА БАЯВОЕ ЗАДАНЬНЕ ПАРТЫІ МОЖНА І ТРЭБА ВЫКАНАЦЬ, РАЗГОРТВАЮЧЫ МАСАВУЮ РАБОТУ ЗА УЗМАЦНЕНЬНЕ КАЛГАСНАГА РУХУ, БЯЗЬЛІТАСНА ЗМАГАЮЧЫСЯ З КУЛАКОМ, З ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦЮ, САМАЦЁКАМ І „ЛЕВЫМІ" ЗАГІБАМІ У СПРАВЕ АРГАНІЗАЦЫІ КАЛГАСНАГА ПРЫЛІВУ

БЯРЭЦЕ ПРЫКЛАД З ПАЛІКАРПАЎСКІХ КАМУНІСТАЎ, ЯКІЯ НА СПРАВЕ ДАКАЗАЛІ, ЯК МНОГА МОЖНА ДАСЯГНУЦЬ У КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ МАБІЛІЗАЦЫЯЙ МАС НА БАРАЦЬБУ З КУЛАКОМ

Посьпехі палікарпаўскіх змагароў за калгасны прыліў

ГРЭСК. (Наш. кар.). У ВЫНІКУ ПАКАЗАЛЬНАЙ РАБОТЫ БОЛЬШАСЬЦІ КАЛГАСАЎ У ВЕСНАВУЮ І АСЕНЬНЮЮ КАМПАНІІ ГРЭСКІ РАЁН ДАБІЎСЯ РОСТУ КАЛГАСНАГА РУХУ. ЗАРАЗ У РАЁНЕ НАЛІЧВАЕЦЦА ЎЖО 43 КАЛГАСЫ ЗАМЕСТ 28 ІСНАВАЎШЫХ ВЯСНОЙ. АСАБЛІВА ТРЭБА АДЗНАЧЫЦЬ УЗОРНУЮ РАБОТУ НЕШМАТЛІКАЙ (4 ЧЛЕНЫ ПАРТЫІ І 2 КАНДЫДАТЫ) ПАЛІКАРПАЎСКАЙ ПАРТ'ЯЧЭЙКІ, ЯКАЯ САПРАЎДЫ ПА- БАЛЬШАВІЦКУ ЗМАГАЛАСЯ ЗА КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ.

Палікарпаўскія камуністы ўдарнулі ў актыўнае змаганьне за калгас камсамольцаў, настаўнікаў, членаў сельсавету, грамадзкія арганізацыі і увесь вясковы актыў.

Парт'ячэйкай былі арганізаваны спэцыяльныя брыгады, якія шпярхам разгортваньня масавай работы дасягнулі вялікіх вынікаў па стварэньні новых калгасаў і ўзбуйненьні існуючых.

Калектывізацыя была цесна ўязана з выканачьнем задач гаспадарча - палітычных кампаній.

Правільна пастаўлена работа палікарпаўскіх камуністаў і гаспадарчыя посьпехі існуючых у сельсавеце трох калгасаў выклікалі ўзмацненьне прыліву, асабліва за апошні час.

ЗА КАСТРЫЧНІК - ЛІСТАПАД ГЭТАГА ГОДУ Ў КАЛГАС ІМЯ ВАРОЎСКАГА ЎСТУПІЛІ 24 ГАСПАДАРКІ, У КАЛГАС ІМЯ ВАРАШЫЛАВА — 41 ГАСПАДАРКА.

ЗА ГЭТЫ-Ж ЧАС У СЕЛЬСАВЕЦЕ АРГАНІЗАВАЛІСЯ ТРЫ НОВЫЯ КАЛГАСЫ, ЯКІЯ ЯДНАЮЦЬ 79 ГАСПАДАРАК. Усяго зараз у калгасах Палікарпаўскага сельсавету 169 бядняцка-серадняцкіх двароў і 20 батраковых-адзіночак, што складае 35 проц. калектывізацыі.

КАЛГАСЫ ПАЛІКАРПАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ЗАРАЗ РАШУЧА ЎЗЯЛІСЯ ЗА ПАДРЫХТОЎКУ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ (СТВАРЭНЬНЕ НАСЕННЫХ ФОНДАЎ, АБМЕРКАВАНЬНЕ ПЛЯНАЎ І Г. Д.).

Ц. МАКАРЭНКА.

Адказ агентам польскага фашызму

ДУБРОЎНА. (НАШ КАР.). У АДКАЗ НА ВЫКРЫЦЬЦЕ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЯНЕРНАЙ ГРУПЫ ПАН ДЭМАЎ СЯЛЯНЕ АДЗІНААСОБНІКІ —БЕДНЯКІ І СЕРАДНЯКІ ВЕСКІ ПУГАЧОВА АРГАНІЗАВАЛІ КАЛГАС «ЧЫРВОНАЕ ПУГАЧОВА». У КАЛГАС УСТУПІЛА 13 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

СЯЛЯНЕ ПАСТАНАВІЛІ ВЫКЛІКАЦЬ ВЕСКІ СТРОЖАВА, ЯКУБАВА, ЧАРНОЎКА І МАКАРАВА ПАСЬЛЕДВАЦЬ ІХ ПРЫКЛАДУ.

М. ХАДУНОЎ.

„Да вясны далёка"

ВУЛА. (Пост «Зьвязды»). «Да вясны далёка» — такія настрої пануюць сярод вульскіх працаўнікоў. Адзін агранам адпачывае, а другі — на вучастковым пункце.

ПЛЯНЫ ЯШЧЭ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ДА СЕЛСАВЕТАЎ, ня гледзячы на тое, што тэрмін ужо прайшоў.

У новых калгасах насенныя фонды ў большасьці выпадкаў яшчэ не засыпаны.

Да вчыстку насеньня прыступілі толькі паасобныя калгасы. У калгасе імя Крупскай гатункоўны авёс, які павінен ісьці на засеў плошчы накалёнік калгасаў пяжыць неабмалочаны, засыпаны сьнегам.

Наркамзем даў заданьне пішырыць яравы клін да 21.115 гэкт., а ўжо снарацілі плян да 16.350 гэкт.

ПІРЭЦ.

Поўная бязьдзейнасьць

ЖЛОБІН. (Наш. кар.). Райза да гэтага часу не распрацавае раённага пляну пасеўнай кампаніі і не давёў яго да сельсаветаў і калгасаў.

Сярод работнікаў райза ёсьць думка, што плян пасеву тэхкультур, вызначаны Наркамзэмам для Жлобінскага раёну, «нібыта занадта вялікі і яго трэба зь

Адкрыты ліст

У рэдакцыю ЦО КП(б)Б—„Зьвязда"

У парадку самакрытыкі і ў інтарэсах развіцьця апошніх, як магутнага рэзерву ажыцьцяўленьня алініцтва і моцы фронту, аграрнікаў-марксыстаў на базе чыстага рэвалюцыйнае марксыстка-ленінскае тэорыі, лічу сваім партыйным абавязкам заявіць аб тым, што ў некаторых з маіх раней зробленых прац ёсьць рад грубых памылак і тэарытычнай блытаніны, якія зводзяць гэтыя працы да становішча ня маючых нічога агульнага з марксызмам. Да гэтых прац адносяцца:

1. Да пытаньня аб стандарце бэконовых заводаў па БССР (Сельская і лясная гаспадарка, 1929 г. № 3);

2. Праблема ўраджайнасьці ў сувязі з разьвіцьцём і стандартам с.-г. індустрыі (Сельская і лясная гаспадарка 1928 г., № 5-6);

3. Броварная прамысловасьць і яе стандарт на тэрыторыі сучаснае БССР, Менск, 1928 г.

Калі апошнюю з іх можна назваць, у сэнсе ўзмацненьня марксыстка-ленінскае метадалёгіі, эклектычнаю, то першыя дзьве ня ўзьнімаюцца нават і да тэзіса пароўны.

Прадпасылкаю і грунтам такога адасобленьня зьявілася тое, што лічу на студэнцкай лаўцы я быў вымушан вучыцца ў такога чалавека, як Г. І. Гарэцкі, які маскаваўся над марксызм, над сьцягам і ў афарбоўцы марксызму шырока прапагандаваў погляды буржуазных тэарытыкаў у галіне стандарту (Тэйлора, Вэбэра, Эйнглендэра і інш.).

Усярыйманьню гэтых поглядаў і ацэнчанасьці ў патрэбнасьці выкарыстаньня гэтых тэорый у сацыялістычным будаўніцтве ў значнай ступені спрыяла тое, што рад відных і, як мне здавалася, аўтарытэтных вучоных і партыйцаў (Варга, Баранскі, Марозаў, Юшкеў і інш.) у сваіх працах бліз усякае крытыкі скарыстоўвалі гэтыя тэорыі і пара рад падручнікаў і літаратурных выступленьняў таксама, як і Г. І. Гарэцкі, прапагандавалі гэтыя тэорыі, уводзілі і, што лічу горш, увосьлі і давяталь у зман вучнёўскую моладзь. Такана гісторыя нікрытычнага ўспрыйманьня і выкарыстаньня буржуазных тэорый.

У некаторым палоне чужых пралетарыяту тэорый я знаходзіўся ў 1927 г. і часткова ў 1928 г., калі, будучы ўжо асьпірантам, над уплывам сэмінарскіх заняткаў на палітэканоміі і дыялектычным матэрыялізьме ў Менску, а таксама ў занятках, гутарках і дыскусіях у аграрным інстытуце Камакадэміі (дзе я знаходзіўся калі году ў камандыроўцы) я пачаў адчуваць «угар» напярэдняга дыханьня атрутнымі газамі. З гэтага часу я пачынаю ўпарта перавучацца.

У чым заключаюцца памылкі маіх апошніх вышэй прац? У тым, што:

1) Раёнкайная тэорыя А. Вэбэра аб размяшчэньні прамысловасьці, набуваемая на црынцыпах буржуазнае палітэканоміі, якая (тэорыя), дзякуючы сваёй буржуазнай абмежаванасьці, нядобрана нават выкідваньць існуючае размяшчэньне прамысловасьці ў капіталістычным грамадзтве, тэорыя яўна нічога сучая марксізм, як адзіную навуку, якая дае магчымасьць ажыцьцяўленьне і стандартных зьяўішч, —гэта тэорыя блескрытычна ўжывалася мною для тлумачэньня размяшчэньня прамысловасьці ў капіталістычных умовах і нават ва ўмовах пераходнага перыяду.

Атрымлівалася, такім чынам, шкодная прапаганда нічога ня вартых, рэакцыйных тэорый або, інакш кажучы, зьвычайных іх апалёгетыям.

2) Пры выкарыстаньні статыстычных і літаратурных матэрыялаў я не праявіў належных крытычных адносін да іх, у выніку чаго аб'ектыўна пападаў у становішча чалавека, які закономарнасьці капіталістычнага грамадзтва перапосіць на ўмовы пераходнага перыяду, якому прыймальны і буржуазныя погляды аб эвалюцыі ў сельскай гаспадарцы, і прыцінчаўскі пэрспэктыўны плян, і інш. буржуазная пашліпіна, — становішча бязвыхаднай блытаніны.

3) У паасобных месцах паказаных вышэй прац я палкам зьліваўся з правапартыйнастычнай трактоўкай—«узамазалежнасьці», «роўнавагі», «роўнаправа» і г. д. у разьвіцьці прамысловасьці і сельскае гаспадаркі—наяўнасьці арганізаванасьці ў капіталізьме ў сувязі з усьведамленьнем яго закономернасьцяй. Такі нынк знаходжаньня ў ідэалёгічных путах буржуазнае навукі і яе апалёгетаў.

Катэгарычна і безагаворачна асуджаючы гэтыя памылкі, я прылажу ўсе сілы на тое, каб яны больш не паўтараліся ў маёй працы.

Пры гэтым лічу неабходным адзначыць, што з першых дзён майго паступленьня асьпірантам у БНДІ імя Леніна (канец 1927 г.) я, як член бюро ячэйкі КП(б)Б інстытуту, вёў рашучае змаганьне з практычнымі правымі беларускага нацыянал-дэмакратызму, а з 1928 году пачаў, разам з іншымі таварышамі, разгортваць гэтае-ж змаганьне на ідэалёгічным фронце. Мною было напісана некалькі крытычных артыкулаў на паасобныя творы контр-рэвалюцыйнага беларускага нацыянал-дэмакратызму, якія (артыкулы) выйшлі ў 1930 годзе паасобнай брашурай—«Супроць беларускае Кандрацьцеўчыны». У гэтым-жа годзе выйшла мая навукова-папулярная брашура — «Калгасы — адзіны шлях сялянства».

У першай з гэтых прац ёсьць таксама рад памылак, якія я лічу неабходным тут-жа адзначыць. Памылкі гэтыя наступныя:

1) На ст. 10, пасьля паказаньня на яўныя мэтадалёгічныя недарэчнасьці некаторых досьледаў па сельскай гаспадарцы БССР, якія праводзіліся буржуазнымі вучонымі (Кісьлякоў, Ліндт, Макараў, Жданові, Ланкоў і інш.), я заяўляю, што недарэчнасьці іх мэтадалёгіі вынікаюць з таго, што «аўтары не аказаліся на належнай вышыні для тэарытычнага вырашэньня праблемы сучасная грамадзтва, яны ня здолелі перамагчы навуковаю аб'ектыўнасьцю сваёй дробна-буржуазнай, буржуазнай і эклектычнай прыроды».

Такі выраз, бязумоўна, памылковы, бо ён дае магчымасьць тлумачыць памылкі паказаных аўтараў толькі іх няпісьменнасьцю, зманзвае іх сьвядомую палітычную мэтаімклівасьць.

2) На ст. 21-ай я заяўляю: «Праўда, беларускі нацыянал-дэмакратызм не пасьпеў яшчэ скласьці зграбнае тэорыі сваіх поглядаў і таму нам даводзіцца мець справу толькі з элемэнтамі гэтае тэорыі, з першымі, часамі вельмі прымітыўнымі, крокамі ў гэтым кірунку»... Гэты выраз таксама памылковы, бо беларускі нацыянал-дэмакратызм, як відаць з далейшага разгляду ў тэй-жа брашуры, якраз меў такую тэорыю. Калі-ж яна ня была надрукавана ў абагуленым праграмным відзе, то ў гэтым «ня віна, а бяда» беларускіх нацыянал-дэмакратаў, бо працаваць ім даводзілася ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту.

3) Памылковаю зьяўляецца мая думка на ст. 73 аб тым, што А. Смоліч цапаў у дробна-буржуазную школу «не таму, што гэта школа яму падабаецца, а дзякуючы сваёй, мякка кажучы, неасьцярожнасьці». Гэты выраз таксама зводзіць пастаноўку пытаньня аб тэарытычных установках А. Смоліча толькі да «нянісьменнасьці», зманзваючы яго, як аднаго з ворагаў пралетарыяту, сьвядомае разыходжаньне з марксыцкай мэтадалёгіяй.

4) Памылковымі зьяўляюцца мае спасылкі—

а) на блытаную думку С. Г. Ужанскага (ст. 72) з далучэньнем да яе і б) на працы па рабінаваньні (ст. 68) Б. Н. Кніповіча і Н. П. Нікіціна, як на «вядомыя», неадзначыўшы адначасова, што гэтыя працы прасякнуты дробна-буржуазнай мэтадалёгіяй.

5) Нарэшце, лічу недахопам маёй працы «Супроць беларускай Кандрацьцеўчыны» тое, што я ня даў у ёй разгорнутай крытыкі ўсяе сыстэмы н.-д. працы па сельскай гаспадарцы БССР, а ў сувязі з гэтым ня даў прац такога нацыянал-дэмакрата, як Г. І. Гарэцкі, які зьяўляўся адным з натхняльнікаў контр-рэвалюцыйнае прышчэпаўчыны і нават кіраўніком тэарытычнага афарбленьня беларускага нацыянал-дэмакратызму ў аграрным пытаньні.

С. МАРГЕЛАЎ.

Ад рэдакцыі: Заява т. Маргелава разьбіралася на бюро ячэйкі пры ВНДІ 26-XI 1930 г. Лічым патрэбным выпіскі з пратаколу ячэйкі па гэтым пытаньні зьмясьціць у дадатак да заявы т. С. Маргелава.

СЛУХАЛІ: Аб памылках у працах тав. **Маргелава:** 1. «Да пытаньня аб стандарце бэконовых заводаў па БССР». 2. «Праблема ўраджайнасьці ў сувязі з разьвіцьцём і стандартам с.-г. індустрыі». 3. «Броварная прамысловасьць і яе стандарт на тэрыторыі сучаснай БССР». 4. «Супроць Беларускай Кандрацьцеўчыны» і яго заявы.

ПАСТАНАВІЛІ: 1. Адзначыць, што паданая заява т. Маргелавым аб прызнаньні ім сваіх памылак у пералічаных навуковых працах у асноўным здавальняючая. 2. Бюро ячэйкі КП(б)Б указае на рад памылак у працы «Калгасы — адзіны шлях сялянства» (тры шляхі разьвіцьця с.-г.: няправільнае тлумачэньне форм зьяўляпаддаваньня і інш.), якія т. Маргелавым прызнаны.

Прымаючы пад увагу здавальняючае прызнаньне т. Маргелавым сваіх памылак, адначасова прапанаваць, каб у сваёй канкрэтнай штодзённай працы, а складу бюро ячэйкі КП(б)Б...

Па Савецкай Беларусі

За падпал калгасу—расстрэл

КРУГЛАЕ. (Наш кар.). Выязная сэсія Вярхоўнага суда БССР, пад старшынствам тав. Процкага, разглядзела справу братоў ПЯТРА і ДЗЯМІДА МАРАЗЕВІЧАЎ, якія ў маі г. г. падпалілі калгас «ЧЫРВОНЫЯ ПРУДКІ». Падпал быў зроблены з мэтай сарваць калгаснае будаўніцтва, перашкодзіць арганізацыі новага калгасу. У выніку пажару зьнішчана 16 гаспадарак калгасьнікаў, жывы і с.-г. інвэнтар калгасу, насеньне і г. д. КАЛГАС ПАНЕС 23 ТЫСЯЧЫ РУБ. СТРАТ. Выязная сэсія Вярхоўнага суда прыгаварыла МАРАЗЕВІЧА ПЯТРА ДА ВЫШЭЙШАЙ МЕРЫ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ — РАССТРЭЛУ; Маразевіча Дзяміда—да 10 год пазбаўленьня волі з паражэньнем у правох пасьля адбыцьця пакараньня, тэрмінам на 5 год.

Галавацяпская камандыроўка

Белбюро ЦК чыгуначнікаў тэлеграфна прапанавала Віцебскаму УЧП з камандыраваць 12 рабочых у Менск на 6-ці месячныя прафкурсы. Віцебскі УЧП 8 дагаварыўся з адміністрацыяй, і 12 чалавек былі камандыраваны. Аднак, курсантам прышлося вярнуцца назад: аказалася, што ў Віцебску ёсьць такія-ж курсы, адкрытыя ЦСНСБ. Белбюро ЦК чыгуначнікаў не дагаварылася з ЦСПСБ, і з гэтае прычыны 12 чалавек былі адараваны з вытворчасьці і пасланы ў непатрэбную камандыроўку.

КУРСАНТЫ.

Дапамагчы рабоце санаторыя Баркоўшчына

ВУШАЧЫ. Раённыя арганізацыі не аддаюць ніякай увагі рабоце санаторыя **Баркоўшчына.** Кіраўніцтва санаторыя нядаўна зьвярнулася ў РВК з просьбай паслаць спэцыяліста для пабудовы электрастанцыі пры санаторыі. Аднак, РВК бюракратычна адказаў: «Спэцыялісты ў час ўсе заняты, паслаць ня можам».

Адмовілі таксама і ў волпуску цьлікоў для будаўніцтва. Прышлося спэцыяльна ехаць у Менск за адной скрынай цьлікоў.

Парсанал санаторыя ня мае спэцвопратк. Работнікі райспажыўтаварыства на адносіну санаторыя налажылі наступную рэзалюцыю: «Спэцвопраткі не загатаўляем, калі магчыма будзе, выдадзім».

Раённыя арганізацыі павінны больш чула адносіцца да патрэб санаторыя і дапамагаць яму ў рабоце.

таксама і ў далейшых навуковых працах ён выправіў свае памылкі. З канстатаваць, што т. Маргелаў у сваіх навуковых працах аб'ектыўна адбіваў яўна варожую ўплыў марксызму-ленінізму, а ў палітычных брашурах апартуністычныя і нацыянал-дэмакратычныя ўхілы. 4. На падставе ўсяго вышэйвылажанага ў адносінах да т. Маргелава, бюро ячэйкі пастанаўляе наступнае: Вывесьці тав. Маргелава са прац па гісторыі літаратуры т. Вазьнясенскага. Уступны даклад т. Гальперынай. Запрашаюцца ўсе навуковыя працаўнікі і студэнты.

— **БАН** У 12 гадз. у пам. ін-ту гістарычных навук БАН (3-ці паверх, № 19)—аўльны сход членаў інстытуту. У парадку дня—даклад праф. Нікольскага на тэму: «Палітэізм і монатэізм у яўрэйскай рэлігіі».

ЗАЎТРА:

— **Дом Камасьветы.** У 10 з пал. гадз. —лекцыя т. Пінчука на тэму. «Аб беларускай кандрацьцеўшчыне». Пасьля —канцэрт. Білеты па РК і ў чыт. Дому.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рабочы т. Панаў выйграў аўтамабіль

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Рабочы заводу імя Ланцуцкага актыўны член Аўтадору т. ПАНАЎ выйграў па 2-й лётарэі Аўтадору лёгкавы аўтамабіль фірмы «Форд». Тав. Панаў выказаў жаданьне скарыстаць аўтамабіль для агітацыйных мэтаў па лініі Аўтадору і для практычнай вучобы аўтадораўцаў.

Усебеларуская нарада клюбных работнікаў

18 сьнежня ў клюбе мэталістаў адкрылася ўсебеларуская нарада клюбных работнікаў. На нараду зьявіліся пераважна маладыя клюбныя работнікі, якія ў гэтым годзе скончылі спэцыяльныя курсы.

Нараду адкрыў загадчык культсэктару ЦСПСБ тав. **Клімковіч.** Ва ўступным слове тав. Клімковіч адзначыў галоўную ролю нарады і важнасьць пытаньняў, што стаяць у парадку дня яе.

Нарада паслала прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і УсеЦСПС.

З дакладам аб становішчы і задачах перабудовы культмасавай работы выступіў тав. **Клімковіч.**

Завод «Энергія» рапартаваў аб сваіх дасягненьнях у клюбнай рабоце.

Учора на ранішнім пасяджэньні разгарнулася спрэчкі па дакладу тав. Клімковіча.

Шо

Наглая вылазка кулакоў

БЕШАНКОВІЧЫ. (Наш кар.). У ноч на 10 сьнежня кулакі зрабілі замах на забойства старшыні СТРЭЛІШЧАНСКАГА сельсавету. Частка кулакоў-тэрарыстых затрымана. Вядзецца сьледзтва.

Паведамленьні

СЕНЬНЯ:

— **Дом Камасьветы.** У 19 з пал. гадз. —даклад т. Мікуліча на тэму: «Перавыбары саветаў і задачы партыі». Пасьля—мастацкая частка. Білеты па РК і ў чыт. Дому.

— ЦК МОПР'у. У 19 гадз.—пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у. Фракцыя—у 18 гадз.

— **Дом Асьветы.** У 19 гадз.—надзвычайны зьлёт культармейцаў выдворчых культбазэўраў. Яўка абавязкова.

— **Дом Пісьменьніка.** У 19 гадз.—шырокі сход Менскай філіі БелАПП'у сумесна з членамі рабочых літгурткоў на прадпрыемствах. У парадку дня: Аб рабоце рабочых літгурткоў і перабудовы усёй работы БелАПП'у. На нараду запрашаюцца прадстаўнікі культсаветаў усіх прадпрыемстваў г. Менску.

— **ЦБ СНП.** У 20 гадз., у гал. корп. БДУ аўд. 302,—вечар разбору навуковых прац па гісторыі літаратуры т. Вазьнясенскага. Уступны даклад т. Гальперы-

Рэдакцыя газ. „Зьвязда" разам з рэдакцыяй газ. „Рабочий" скліканць на 22 сьнежня ў 7 гадз. веч. у памяшк. Дому Камсамолу (Камсамольская, 25)

НАРАДУ МЕНСКІХ РАБКОРАЎ,

прысьвечаную праверцы і агляду па выкананьні прамфінпляну ўдарнога кварталу і подрыхтоўкі да 3-га году 5-годкі.

Рэдакцыі газэт: «ЗЬВЯЗДА і «РАБОЧИЙ».

Фрунзаўскі і Кастрычніцкі РК КП(б)Б і ЦСПСБ

21-га сьнежня ў памяшканьні клюбу саўгандальслужачых у 6 гадз. вечара

СКЛІКАЮЦЬ

канфэрэнцыю ўдарнікаў г. Менску

З ПАРАДКАМ ДНЯ:

1) Папярэдняя выпіскі выкананьня прамфінпляну асобнага кварталу і задачы ўдарнікаў у выкананьні прамфінпляну 3-га рашаючага году 5-гадзіны.

2) Задачы ўдарнікаў у правядзеньні спрэвядзлива-перавыбарчай кампаніі.

Мандаты выдаюцца штодзённа з 10 гадз. ранку і 5 гадзін дня ў ЦСПСБ.

Агульная канцылярыя.

1-я МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ КП(б)Б

адкрываецца 26 сьнежня ў 6 гадз. веч. у Доме Камасьветы імя К. Маркса, з наступным парадкам дня:

1) Чарговыя гаспадарча-палітычныя задачы партыі.

2) Выніці ўдарнага кварталу і задачы Менскай партарганізацыі на 3-ці год пяцігодкі.

3) Выбары кіруючых органаў арганізацыі.

Выдача мандатаў праводзіцца па райкомах КП(б)Б: па Фрунзаўскім—т. Калганам, па Кастрычніцкім—т. Мішам у наступны час: 23 і 24 сьнежня з 10 гадз. ран. да 4 гадз. дня і з 6 да 9 гадз. веч.; 25 сьнежня увесь дзень да пачатку канфэрэнцыі.

Сьпіс дэлегатаў павінен быць паданы ячэйкамі ў РК не пазьней 22 сьнежня.

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ МОПР'у

СУБОТА 27 СЬНЕЖНЯ

З мэтай стварэньня адзінага гаркому МОПР'у ў г. Менску Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР склікае

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ МОПР'у

Клюб Гарсавет

Парадак дня:

1. Даклад аб выніках III-га Усебеларускага зьезду МОПР'у і чарговыя задачы—дакл. тав. ЦУДЗІН.

2. Выбары гаркому і рэвіз. камісіі.

Модус выбараў дэлегатаў:—на 0 членаў МОПР'у—1 дэлегат. Ячэйкі, якія налічваюць менш 50 членаў— выбіраюць 1-го дэлегата.

Для актывістаў-монраўцаў ячэйкі МОПР'у могуць атрымаць запрашальныя білеты на канфэрэнцыю.

Мандаты і запрашальныя білеты будуць выдавацца ў ЦК МОПР'у штодзённа з 7-мі да 9-ці гадз. веч.

ЦК МОПР'у просіць усе ячэйкі МОПР'у гор. Менску зараз-жа прыступіць да выбараў дэлегатаў на канфэрэнцыю, скарыстоўваючы для гэтай мэты ўсе сходы, прысьвечаныя перавыбарам саветаў, па лініі фабзаўмясцкомаў, а таксама і сходы, прысьвечаныя кампаніі зімовай дапамогі палітзьняволеным.

ПАЧАТАК РОЎНА а 7 гадз. веч.

Пасьля дзелавой часткі—КІНО.

ЦК МОПР'у БССР.

Беларускі Дзяржаўны тэатр

СЕНЬНЯ, 20 сьнежня—паказ для Вучпрафсэчу

У. Вішнеўскі.

ПЕРШАЯ КОННАЯ"

прысьвечана Чырвонай арміі.

Пачатак у 7 гадз. Білеты ў касе тэатра.

Клюб імя К. Маркса

САВЕЦКАЯ ФІЛЯРМОНІЯ

22 сьнежня

Адзіны канцэрт

МИКАЛАЯ ОСІПАВА

і Гэвітрыя КАЙСАРАВА.

У праграме: Шопэн, Ліст, Сэн-Санс, Васілевка і Крэйсфіеў.

Білеты прадаюцца ў раб. тэатр. касе з 12—2 і 4—6. а ў дзень канцэрту ў клюбе К. Маркса з 5 гадз. веч.

Пачатак—ў 8 пал. гадз. веч.

КІНО „Культура"

НОВЫЯ ЗАМЕЖНЫЯ ФІЛЬМЫ

КАЛЮЧЫ ДРОТ драма ў 8 дзеяньнях

Звыш праграмы

ЭКСТРАНЫЯ выпуск часопісу „Союзкіно"

Суд над „прампартыяй"

Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м., і 10 г. 20 м.

КАСА—ад 5 гадз.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ПАДВОЙНАЯ ПРАГРАМА

I. Чалавек застаўся адзін кіно-драма ў 6 част.

Экстранны выпуск часопісу „Союзкіно"

Суд над „прампартыяй"

II. Гэты зэмежны гукавы фільм

ЧЭМПІЁНЫ ПЛАВАНЬНЯ

Каса адчынена з 5 гадз. веч.

Пачатак сэансаў у 6 з пал. гадз.

КІНО „ПЕТЭРБУРГСКІЯ МОЛЬНІЯ"

БЭСТЭР КІТОН у замежным фільме

ГЕНЭРАЛ

Пачатак: 1-га сэансу ў 6 гадз. Каса—ад 4 г. 30 м.

КІНО „Гігантары"

Мастацкі фільм

За манастырскай сьцяной

У гал. ролі НІКА Л.І.

Пачатак 1 сэансу ў 6 гадз. веч. Каса адкрыта ад 4 гадз. 30 м.

Кіно „Юны піянэр"

Гістарычны фільм

ПАЛАЦ І ЦЫТАДЭЛЯ

драма ў 10 частках.

Пачатак сэансаў у 1 г. дня і 3 г. дня. Каса—ад 12 гадз.

КІНО „Спартак"

Выдатны фільм

КАЛЕСКІ РЭГІСТРАТАР

драма ў 7 частках.

У гал. ролі МАСКВІН.

Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 45 м., 10 г. 45 м.

Каса—ад 5 гадзін.

МЕНСКІЯ ВЯЧЭРНІ РАБФАК

паведамляе,

што канчатковы прыём заяў на рабфак адбудзецца да 23-га сьнежня.

Усім заўкомам і саюзам неабходна да 23-га сьнежня ўдарным парадкам камандыраваць рабочых, жадаючых паступіць на рабфак.

Іспыты на вячэрні рабфак будуць праводзіцца з 22-га па 27-е сьнежня; залічэньне на рабфак з 27-га па 30 сьнежня.

Прыём заяў на дурыскае адзяленьне працягнут да 25-га сьнежня.

ДЭКАНАТ РАБФАКУ.

Анонс! У хуткім часе ў кіно-тэатры Анонс!

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

— лепшы фільм —

спавутага амэрыканскага рэжысэра

СЭСІЛЬ ДЭ-МІЛЬ

БЯЗБОЖНАЯ ДЗЯЎЧЫНА

Драма ў IV разьдзелах і 2-х сэрыях.

Падрабязнасьці асобна.

КЛЮБ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ

21 сьнежня ў 9 гадз. веч.—

ДЫСПУТ

на тэму:

«Рэлігія, навука і навуковыя працаўнікі».

Для абмену думкамі запрошаны наступныя навук. працаўнікі: Багдановіч, Ів. тужаў, Бурстын, Бурак, Валабрынскі, Выдра, Вяршук, Громер, Маўрыдзіядзы, Мядкіх, Нікольскі, Панкевіч, Прыляжаеў, Розанаў, Сітэрман, Цітоў, Чарвакоў і інш.

Уступнае слова праф. С. Я. ВАЛЬФСОНА.

Уваход—вольны.

Да вядома ўсіх ячэек МОПР'у БССР

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ МОПР'у БССР

ПАВЕДАМЛЯЕ,

што ўсім райкомам МОПР'у БССР разасланы падпісныя лісты для правядзеньня кампаніі зімовае дапамогі палітзьняволеным і іх сем'ям.

Усім ячэйкам МОПР'у ўраду і вёскі трэба зараз-жа зьявіцца ў райком за атрыманьнем падпісных лістоў. Усе лісты выдаюцца пад адказнасьць старшыні альбо сакратара ячэйкі МОПР'у, усе лісты таксама будуць пранумараваны.

Пасьля правядзеньня ў ячэйках збору па падпісных лістох, ячэйкі зараз-жа павінны сабраць грошы, перавесьці на рахунак ЦК МОПР'у БССР праз пошту. У перавядах у графе «добраахвярныя ўзносы» прыпісаць словы «КЗД».

Пасьля правядзеньня збору і здачы грошай на пошту, усе ячэйкі МОПР паведамляюць у райком аб суме зданых грошай па КЗД і №№ падпісных лістоў.

УВАГА—Падпісныя лісты застаюцца ў справах ячэйкі, як грашовы апраўдацельны дакумант.

ЦК МОПР'у БССР.

ВЫДАВЕЦТВА ЦК МОПР'у СССР

Москва, 9, ул. Огарева, д. № 4. Тель. Отд. Расп. 3-08-47

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 1931 г.

на масавую грамадзка-палітычную і ілюстраваную часопісь

„ИНТЕРНАЦИОНАЛЬНЫЙ МАЯК"

(б. „Путь Мопра")

(Год выд. сёмы). Выходзіць тры разы ў м-ц.

Гадавыя падпісчыкі, якія заплацілі ўсю падпісную плату да 1 ліпеня, атрымаюць у жніўні м-цы ДАРМОВА

КАРМАННЫ ПАЛІТЫЧНЫ СЛОЎНІК

разьмерам звыш 5 аркушаў у пераплёце.

Ячэйкі МОПР прэміруюцца выдавецтвам.

За кожныя 20 гадавых падпісак па 2 руб. літаратурай.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

На 12 мес.—3 руб. || на 3 мес.—75 кап.

„ 6 „ —1 руб. 50 кап. || „ 1 „ —25 кап.

Гадавым падпісчыкам прадастаўляецца растэрміноўка плацежа: пры падпісцы—1 руб., 1 сакавіка—1 руб. і 1 чэрвеня—1 руб.

На кіруючы орган ЦК МОПР'у СССР

„СПУТНИК МОПРОВЦА"

выходзіць адзін раз у два тыдні.

„Спутник Мопровца"—неабходны дапаможнік для кожнай ячэйкі, для кожнага актывіста.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

на 12 мес. 2 руб. || на 3 мес.—50 кап.

„ 6 „ —1 руб. || „ 1 мес.—20 кап.

Падпіску здавайце ў любое паштовае аддзяленьне або лістаносцу.

Уваравіцкаму райсельбанку (м. Уваравічы БССР, 5 клм. ад ст. Чы-г. 40 хв. язды) ПАТРЭБНЫ:

1 інспэктар-знаўмеіст з окладам 150 р. у м-ц.

1 сугэгістар (п. м. ст. бухгальт.) — 120 р. у м-ц.

2 рахункаводы—75 р. у месяц.

Умовы пераезду згодна арт. 82 КЗаП. Прапановы адрасаваць: м. Уваравічы, райсельбанк, або в. Менск Белкалгасбанк, аддзел кадраў.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

АДДЗЕЛ ПАДПІСНЫХ І ПЭРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАНЬНЯЎ

Адкрыта падпіска на ўсе выданьні Белдзяржвыдавецтва на 1931 г.

„МАЛАДНЯК"

Орган БелАПП'у

Змагар за пралетарскую літаратуру нацыянальную па форме і пралетарскую па зьмесьце.

Выходзіць 1 раз у месяц

Умовы падпіскі:

12 мес.	6 мес.	3 мес.
5 р.	3 р.	1 р. 50 к.

„КАМУНІСТЫЧНАЕ ВЫХАВАНЬНЕ"

Орган Наркамасьветы і саюзу Працаўсьветы

Методыка, педагогіка і палітасьвета.

Выходзіць 1 раз у месяц

Умовы падпіскі:

12 мес.	6 мес.	3 мес.
8 р.	4 р. 50 к.	2 р. 30 к.

„ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ"

Пад рэдакц. МІХАСЯ ЧАРОТА.

Двухтыднёвая адзіная ў БССР багата ілюстраваная часопісь

1000 фота-здымкаў, якія ілюструюць сацыялістычнае будаўніцтва СССР, БССР і замежнае жыцьцё

300 малюнкаў лепшых мастакоў БССР.

200 апавяданьняў, вершаў і нарысаў.

УМОВЫ ПАДПІСКІ:

12 мес.	6 мес.	3 мес.
3 руб.	1 р. 50 к.	75 кап.

ЯЧЭЙКІ ЛКСМБ, ПРАЦАСЬВЕТНІКІ, МЯСЦКОМЫ, РАБАЧКОМЫ!

Арганізоўвайце распаўсюджаньне беларускіх часопісяў. Вылучайце зборшчыкаў падпіскі. Зборшчыкам падпіскі 10 проц. скідкі.

„ПОЛЫМЯ"

ВЫДАНЬНЯ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

Старэйшая ў БССР часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі і крытыкі.

Выходзіць 1 раз у месяц

Умовы падпіскі:

12 мес.	6 мес.	3 мес.
10 р.	5 р. 50 к.	3 руб.

„УЗВЫШША"

ВЫДАНЬНЯ БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

Літаратура, мастацтва і крытыка.

Выходзіць 10 кніг у год

Умовы падпіскі:

12 мес.	6 мес.	3 мес.
6 р.	3 р. 50 к.	2 р. 30 к.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: аддзелам падпісных і пэрыядычных выданьняў БДВ, Менск, Савецкая, 79, усімі кнігарнямі, кіёскамі і ўпаўнаважанымі БДВ, усімі паштова - тэлеграфнымі канторамі і крамамі спажывецкай кааперацыі.

ЦБ СНП БССР выказвае спачуваньне Вальфсону Сямёну Якаўлевічу з прычыны сьмерці яго **БАЦЬКІ.**

КЛЮБ ХАРЧАВІКОЎ ІМЯ СТАЛІНА

СЕНЬНЯ, 20 сьнежня, у 7 гадз. вечару адбудзецца

агульна-гарадзкі сход рабочых харчовай прамысловасьці.

ПАРАДАК ДНЯ:

справаздача УБК саюзу. Пасьля дакладу—кіно. Уваход па членскіх білетах.

Спадчаровая яўка ўсіх членаў саюзу абавязкова.

ПРАЎЛЕНЬНЕ.

21-га сьнежня ў 11 гадз. раніцы ў памяшканьні Белдзяржтэатру

АДБУДЗЕЦЦА

АГУЛЬНЫ СХОД ПРАЦАЎНІКОЎ БДТ-2

з удзелам рабкораў, аўтакораў і прадстаўнікоў падшэфнай вайсковай часьці

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Інфармацыя брыгады НКА па агляду тэатру.

2. Даклад дырэктара БДТ-2 т. Волкскага аб двойнасьці тэатру.

Запрашаюцца члены БелАПП'у, рабочыя фабрычна-заводзкіх прадпрыемстваў і акторы іншых тэатраў г. Менску.

ПАТРАБУЮЦЦА ПРАЎЛЕНЬНЮ БЕЛДЗЯРЖСНАБУ (Менск)

ВОПЫТНЫЯ:

Інжынэр-будаўнік і тэхнолёг-забесьпячэнец.

Эканамісты.

Тэхнікі-будаўнікі.

Забесьпячэнцы па мэталітаварах, хэмтаварах, электратаварах, інструментарыю, будматар'ялах.

Таварэзнаўцы па электра, хэм. і смазных вырабах.

Зварачацца з прапановамі з апісаньнем кароткай біяграфіі і пракажэньня службы ў праўленьне Белдзяржснабу (Менск, Ленінская вул., дом Камунгаспу).

СССР СТАНОВІЦЦА КРАІНАЙ ТРАКТАРАЎ І АЎТАМАБІЛЯЎ

НОВЫЯ СОТНІ ТЫСЯЧ ПРАЦАЎНЫХ уступаюць з Аўтадор. каб прыняць удзел у грандыёзнай гістарычнай рабоце.

АЎТАМАБІЛЬ, ТРАКТАР, ДАРОГА, МОТАЦЫКЛЬ, ГІСЭР, МАТОРНАЯ ЛОДКА, АЭРАСАНІ, АМЭРЫКАНСКАЯ, ЭЎРАПЕЙСКАЯ І САВЕЦКАЯ ТЭХНІКА БЯЗРЭЙСКАВАГА ТРАНСПАРТУ І АЎТАДОРАЎСКАЯ РАБОТА—шырока, наглядна і практычна асьвятляюцца на старонках самай шматпрадаванай часопісі гадзе выпуску

„ЗА РУЛЕМ"

Падпіску здавайце на пошту або лістаносцам.

Пераводы ў выд-ва пасылаць на сэрбы.

Акц. Изд. О-ва „ОГОНЕК", Москва, 6, Страстной бул. 11.

ЗА РУЛЕМ

ілюстраваны, ілюстраваны на сучасна-тэхнічная часопісь—орган Цэнтральнага Савету Аўтаходу

Адказны рэдактар И. ЛЕНСКІ.

Падпіска на 1930-31 г. прымаецца з сьнежня на любыя тэрміны.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА: „ЗА РУЛЕМ" з прылаж. Бібл. „ЗА РУЛЕМ" (па 2 шт. у мес.)- 12 мес. (з 1-1)-8 р., 6 мес.—4 р. 50 к., 3 мес.—2 р. 40 к., „ЗА РУЛЕМ" без прылажэн. 13 м.—4 р. 40 к., 12 м.—4 р., 6 м.—2 р. 15 к., 3 мес.—1 р. 10 к.

Вялікая ілюстраваная кніга „Автодорожный альманах" усім падпісчыкам за плату 1 руб. 50 коп.

Свячасовая падпіска—дае шмат гарантыя акуратнага атрыманьня часопісі.

Менск, друкарня «Зьвязды».

Менск. Галаўлітбыт 3176.